Іна Снарская

Дзве зямлі – дзве долі

Палтава
2006

kamunikat.org

* * *

Душу бяссонную маю
Ратуюць дрэвы.
На сёмым небе, на краю,
Іх родны бераг.

На сёмым небе іх спакой.
Не б’е пад сэрца
Калянай вогненай рукой
Шалёны вецер.

Не разрывае на шматкі
Галінкі-лёсы.
Там за хвілінамі вякі
Цякуць у восень.

Там караны, як паясы, –
Не страшна ўмерці.
Мяне завуць мае лясы
На мове сэрца.

kamunikat.org

* * *

Душі безсонної причал
Дерева спинять.
На сьомім небі їх свіча
І вечір синій.

На сьомім небі їх ріка,
І б’ється світлом
Тверда палаюча рука
Гнідого вітру.

Не розриває на шматки
Гілки і долі.
Там за хвилинами віки
Зійшлися в полі.

Коріння там, як пояси, –
Не страшно вмерти.
Перекладуть мене ліси
На мову серця.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

* * *

А калі згарбеюць плечы,
А калі знямеюць рукі,
А калі засмягнуць вусны,
А калі здранцьвееш ты, –
Ацалеюць толькі крылы –
Дзве магутныя дубровы,
А ў дубровах шчырым словам
Пракавечныя званы.

* * *

А коли згорбіють плечі,
А коли затерпнуть руки,
А коли вуста зніміють,
А коли змілієш ти, –
Не здадуться тільки крила –
Нам шумітимуть діброви,
А в дібровах щиродзвонним
Буде гук старих віків.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Адна зямля падставіла рукі,
Каб не ўпала на дол.
Ліўся дождж, і кропляў мудрыя гукі
Загаворвалі боль.

Другая зямля ратавала слова,
Дзе вусны агнём пякло,
Дзе птушка ляцела, ляцела на волю,
Шукала жытло.

І гэтыя белыя, чыстыя строі –
Зары светлы ўздых
Выткалі мне дзве зямлі, дзве долі,
Дзве песні маіх.

kamunikat.org

* * *

Одна земля підставила руки,
Щоб додолу не впала,
Лився дощ, і крапель мудрі звуки
Біль мені тамували.

Друга земля рятувала словом,
Де вуста вогнем обпікало,
Де пташка летіла, летіла на волю,
Гніздечко шукала.

Рушники оці, чисті, як поле,
Світлий подих зорі,
Виткали дві землі, дві долі,
Дві пісні мої.

Переклала Людмила Таран-Пономаренко

kamunikat.org

Радзіме

Буду сніць палі і пушчы,
Сон лясоў, напэўна, вешчы.
Я травою невідушчай
Вышывала слова “вечнасць”.

Вышывала-варажыла,
Залацела буйна жыта.
Дзе душа спяліла крылы,
Я складала вершы-міты.

Так няўмольна і балюча
Ллецца дождж, сівеюць скроні…
Ад зары маёй гаючай
Кветка-восень на далоні.

Kamunikat.org

Батьківщині

Поле й пуща – сниться воля,
В снах лісів – глибини віщі.
Заговірною травою
Вишивала слово “вічність”.

Вишивала-ворожила,
Золотилось буйно жито…
Де душа ростила крила,
Я складала вірші-міти.

Невмолимо і болючо
Ллється дощ, сивіють скроні…
Де зоря моя палюча,
Квітка-осінь на долоні.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

Праз вокны дрэвы прараслі,
Спяшаліся да сініх сноў.
І снег на сцежцы хутка таяў,
І пахала ў горадзе вясной.

Анёлак мой ружовакрылы
Хадзіць вучыўся, як дзіця,
І веі цёплы вецер сніл
Да шалу і да забыцця.

І падымаўся цёплай паскай
Над домам нашым новы дзень…
А я тваёй чакала ласкі
Усё радзей.

kamunikat.org

* * *

Крізь вікна проросли дерева,
Злетілися до синіх снів.
І сніг на стежці – синє мрево,
І міста погляд завеснів.

І янгол мій рожевокрилий
Ходити вчився, як дитя,
І вії теплий вечір снили
До шалу і до забуття.

Піднявся, ніби тепла паска,
Над хатою святковий день…
Та спокій мій і твою ласку,
Печаль краде…

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Буры сыч

Боль мой, буры лясны сыч,
Ты мне вочы ў ночы пазыч,
Разбуры мой здрадлівы сон
І крылом захіні, і крысом.

Красамоўна маўчанне твае:
Там шукае свой скарб груганнё,
Там цякуць у лясныя вякі
Пракавечныя песні ракі.

А з рукі падымаецца ветах
На скрыжалях вятроў запаветных.
Гэта ўсё падуладнае мне,
Пакуль сыч за сцяною раве.

kamunikat.org

Сич бурі
Болю, бурі дібровний сич,
Мені очі в ночі позич,
Скаламуть мій зрадливий сон,
І крилом захисти, і крисом.

Красномовне мовчання твоє:
Шукачем скарбу вихор стає,
Там течуть у дібровні віки
Предковічні пісні ріки.

А з руки – розпростерті віти
На скрижалях вітрів заповітних.
Тут усе підвладне мені,
Доки сич пророкує дні.
Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Ваўкалака

Я звяроў вучыла размаўляць,
Я чытала ім лісты і кніжкі,
Ды глядзелі вочы ваўчанят
Праз мяне ў сусвет лясны, няблізкі.

Я звяроў вучыла маляваць,
Ім палітру падбірала з неба
І з дажджом мяшала зарапад,
А яны жадалі толькі хлеба.

А спявалі мы амаль адно,
Калі поўня адчыняла вокны,
У вачах сляпучае сяйво
Адбівалася абразам воўчым.

Як сірочы плач хістаў зямлю,
То выццё ваўчынае сціхала.
Я спявала песню не сваю –
Ваўкалакам выла і стагнала.

Я спявала, а вакол ваўкі
Абарону ланцугом трымалі,
Калі людзі з-за маёй ракі,
Як на ловы груганнё склікалі.

Як на ловы, як на вечны скон
Замаўлялі мне хаўрус сабачы.
А ваўкі не разумелі слоў,
Толькі разумелі голас плачу.

Я звяроў вучыла размаўляць.
Я людзей прасіла спачуваць…

Kamunikat.org

Вовкулака

Розмовляти вчила я звірят,
Я читала їм листи і книги,
І дивились очі немовлят
Чисті-чисті, ніби очі снігу.

Малювати вчила я звірят,
Фарби неба брала я крізь шибу,
Із дощем змішала зорепад,
А вони прохали тільки хліба.

Ми співали, ми були одним,
Стала повінь нашими піснями.
У очах сліпучі холоди
Відбивались вовчими вогнями.

Плач сирітський сходив у гаю,
І виття потроху затихало.
Я співала пісню не свою –
Вовкулаком вила і стогнала.

Я співала, а довкіл вовки
Оборону ланцюгом тримали,
Поки люди десь із-за ріки,
Як на лови круків закликали.

Як на лови, як на вічний тлін
Замовляли ворожбу собачу.
Та вовки не розуміли слів,
Тільки розуміли голос плачу.

Я навчала звірів розмовлять,
Я людей просила співчувать…

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

Піліпаўка

“Як Піліпаўка настане,
то ваўкі ідуць гайнёю…”
(З Тураўскага слоўніка)

Вочы ў душу заглядаюць зверам,
Вочы душу пазбаўляюць веры.
Вечар у верасні – мой нарачоны
Б’ецца галінай халоднай і чорнай.

Воўк мне на плечы лапы кладзе,
Будзе ён побач сядзець і глядзець:
Вочы у вочы, агмень у агмень
Вечна са мною вечны мой цень.

Побач са мною – мудрэйшы, чым я.
Побач са мною – кат і суддзя.
Будзе сціскаць у цісках галаву,
Будзе мой боль ападаць на траву…

Выслізнуць я ад яго не змагу –
Шляхам звярыным у ноч пабягу.
Поўня вугельным крылом праз мяне
Нешта завые і нешта спяе…

Вочы мае вырываюцца ў цень,
Рукі мае загаворваюць дзень,
Косы мае адліваюцца ў поўсць, –
Хто гаспадар тут, а хто толькі госць?

Як чалавеку ваўка зразумець?
Будзе адзін з нас сядзець і глядзець:
“Ты, чалавек, чалавекам застаўся?
Што, небарака,
папаўся, папаўся?..”

Kamunikat.org

Пилипівка

«Як Пилипівка настане,
то вовки зберуться в зграю…»
(З Турівського словника)

Очі в мені виглядають звіра,
Очі мене позбавляють віри.
Вечір у вересні – мій наречений
Гілкою б’ється і просить прощення.

Лапи на плечі вовк покладе,
В душу свою він мене поведе.
Очі у очі. Вогонь у вогонь.
Вічність зі мною – тінню його.

Поруч зі мною – мудрійший, ніж я.
Поруч зі мною – кара моя.
Втіхою-зрадою стисне чоло –
Біль мій дощем упаде на зело…

Прийде туман. Не втікатиму я.
В іклах блищатиме доля моя.
Повінь крилата важко зітхне,
Чорні вуста поцілують мене.

Очі мої вириваються в тінь,
Руки мої закривавили день,
Шерстю стають мої коси тугі…
Хто тут господар, а хто гість туги?

Вовка людині не зрозуміти:
Буде один з нас у вічі дивитись:
“Був ти людиною. Ким ти зостався?
Що, небараче, попався, попався?..”

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

Чароўная чапля
Чароўная чапля на белай назе
У ноч пераходзіць вандроўніцай змрочнай.
Супыніцца час у сляпучай вадзе
Адчайнаю песняю, ветрам паўночным.

І птушка крыло пакладзе на кусты,
Сунічную спёку і чорныя вочы.
Чатыры дарогі натоляць масты,
Якія крывавяць на золку сірочым.

kamunikat.org

Чарівна чапля
Чапля чарівна на білій нозі
В ніч переходить, мандрівниця вічна.
Час зупиняється, меркне, як зір,
В пісні тужливій, вітром північним.

Птах на кущі опускає крило,
Спеку суничну, прочорнені очі.
Чотири дороги до мосту звело,
Де сутінь закрила кривавицю ночі.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Каляды

“Плач, дитино, плач…
То янголи від тебе відлітають…”
(З фільму “Украдене щастя”)

Хрыстос нарадзіўся –
ў гарачых далонях
Званочкамі цешыцца смех.
Вунь неба ліецца на беразе поўні
З усіх беспрітульніх стрэх.
Вунь дрэвы вірують:
у вырай, у вырай,
Мяне пакідаюць зямлі,
У вас – карані,
а ў мяне іх бяскрылле
Гарыць, як лямеш на раллі.
У вас карані,
а ў мяне толькі вечар –
Нашчадак змарнелых вякоў.
Зноў вецер, зноў вецер
ірвецца за плечы
З усіх ледзяных замкоў.
Зноў дзверы, зноў дзверы
затулены цемрай
І вокнаў аслеплі агні…
Кранаюся вуснамі ветразя веры:
Мой Божа, мяне памяні.

Kamunikat.org

Коляди

“Плач, дитино, плач…
То янголи від тебе відлітають…”
(З фільму “Украдене щастя”)

Христос народився –
в гарячих долонях
Озвався дзвіночками сміх.
А з неба розливи – захмарена повня
З усіх безпритульних стріх.
Дерева в молитві:
у вирій, у вирій…
Мене залишають землі.
В них корені,
я – у безкрилості щирій,
Мов леміш в лискучій ріллі.
З корінням вони,
а для мене – лиш вечір,
Нащадок змарнілих віків.
А вітер, а вітер
стискає за плечі
Морозом нещадних замків.
А двері, а двері
повискують звіром,
Ні вогника – царство мани…
Хапаю вустами розвихрення віри:
Мій Боже, мене пом’яни.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

Я не ўмею варажыць,
Толькі страт зямное шчасце
Прывучае проста жыць
І паклоны Богу класці.

Я не ўмею варажыць,
Дзе за ніткай скарб кладзецца.
Прывучаю не тужыць
Сваё зморанае сэрца.

І малюся дзень за днём,
Крок за крокам, век за векам…
Мае плечы ўкрыў анёл
Зорным небам, сінім ветрам.

Kamunikat.org

* * *

Я не вмію ворожить,
Тільки втрат земних ненастя
Вчить так просто й мудро жить
І поклони Богу класти.

Я не вмію ворожить,
Де до нитки скарб кладеться.
Я привчаю не тужить
Зморене осіннє серце.

І молюся день у день,
Крок за кроком, вік за віком…
За плечима дощ іде,
І слова тремтять на вітрі.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

* * *

Навекі сонца гарады
Закрытыя ад здрады цемры,
А я спяшаюся ў мяды,
У прасвятлёны зорны церам.

А там рака – нашчадак ніў
Шчаслiва свецiцца зямлёю,
I адмысловыя агнi
Гарацъ у ветраках зялёных.

Лунае смех, цвітуць сады
I лёгка так, што мудрасць сэрца
Ачышчаная ад бяды
Святкуе свой узлёт над смерцю.

Маё жыццё цяпер Тваё…
На падваконні свечка цвеліць,
А я ўжо вольная ад цела
Плыву ў блакіт Тваіх гаёў.

kamunikat.org

* * *
Навіки сонячні міста
Чарівні висіяли зерна.
Я наблукалась по світах
І поспішаю в світлий терем.

А там ріка – нащадок нив
Щасливо світиться землею,
Ясні немислимі вогні
Горять у вітряках зелених.

Лунає сміх, цвітуть сади,
І легко так, що мудрість серця
Очистилася від біди,
Святкує свій політ над смертю.

Моє життя – в очах Твоїх…
У свічки виростають крила,
І я, вже звільна від тіла,
Пліву в блакіть Твоїх гаїв.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

* * *

Вугал ночы – край малітвы,
Кроў дажджу, спакой самотных.
У далонь зары наліта
Сто грахоў маіх смяротных.

Сто спакус маіх адчайных
Паяднаць душу і цела…
Там, дзе кнігаўка крычала,
Толькі свечачка ўцалела…

kamunikat.org

* * *

Покуть ночі – край молитви,
Кров дощу, самотніх спокій.
У зорі долоні житні
Сто гріхів стікають соком.

Сто спокус моїх одчайних
Поєднати душу й тіло…
Там, де іволга кричала,
Тільки свічечка вціліла.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

Доўгае чаканне вясны

Калі сцямнее,
сцішыцца завея,
Калі сцямнее,
запалю святло
І ў садзе сінім
на галінах-веях
Пакіну ўсё,
што набыло жытло.
І ўцісну неба
ў крумкачову зрэнку
Неспадзяваным
рабаціннем шкла.
Ля чорнай прорвы
прастаю да веку,
Прыкутая
снягамі да акна.

Kamunikat.org

Довге чекання весни

Коли стемніє,
стишиться завія,
Коли стемніє,
світло запалю,
І полем синім
я заполовію,
І кину все,
що знаю і люблю.
Тепло небес
схоаваю під повіки –
Ясний сувій
весільного сукна,
І, мабуть,
тут залишуся навіки,
Притиснена
снігами
до вікна.

Переклав Сергій Осока

Kamunikat.org

* * *

Стыне люты за акном.
Ах, якія дзіва-кветкі:
Кветкі-слёзы, кветкі-сон,
Кветкі – кволыя падлеткі.

У маіх руках дрыжаць,
Быццам помняць нашу тайну, –
Я хадзіла іх збіраць
У далёкім цёплым траўні.

Я прасіла, каб жылі,
Не да лета, хоць да ліха…
Ноч кранаецца зямлі.
Сон брыдзе самотным мніхам.

kamunikat.org

* * *

Стигне лютий за вікном.
Ой, які ж то диво-квіти:
Квіти-сльози, квіти-сон,
Квіти – нерозумні діти.

У моїх руках тремтять,
Ніби пам’ятають здавна, –
Я ходила їх збирать
У далекім теплім травні.

Я просила, щоб жили,
Не до літа, хоч до лиха…
Ніч припала до землі.
Сон збирає хлібні крихти.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

Паўночны вецер

Вы чуеце – вецер,
вы бачыце – вецер?
Паўночны мой брат абдымае за плечы,
Сціскае за плечы,
за вокнамі крочыць.
Мяне распрані і разуй гэтай ноччу.

Здымі апранахі, як лісце, змяці,
З табой па далоні я буду ісці,
З табой па далоні
ў шалёны твой лёс.
І лес захіне нас,
і зоркі,
і слёзы…

Kamunikat.org

Північний вітер
Ви чуєте – вітер,
ви бачите – вітер?
Північний мій брат заглядає у вічі,
Чаклує, стиска,
обіймає за плечі…
Мене роздягни, дозволяю, в цей вечір.

Зніми мої шати, як листя змети,
Удвох по долоні ми будемо йти,
Удвох по долоні
в шалену вдачу…
І ліс прийме нас
на зорі,
і заплаче.

Переклала Людмила Таран-Пономаренко

Kamunikat.org

* * *

Адгарэла, адстагнала,
Адцярушыла пяском.
Я ў лясы сусвет прыбрала
І звязала паяском.

Дзе вы, рукі, дзе вы, крылы? –
Спавядаюцца зямлі,
А бацькоўскія магілы
Прарастаюць на раллі.

Kamunikat.org

* * *

Відшуміла дивним вітром,
Відгоріла, відстогнала,
Ранок заховала хитро
В лісі й стрічкою зв’язала.

Де ж ви, руки, де ж ви, крила? –
Сповідаються землі,
Там, де батьківські могили
Проростають на ріллі.

Переклала ЛюдмилаТаран-Пономаренко

kamunikat.org

Песня

Дзе з барвовых берагоў
Звон збівае полымя,
Адштурхнулася зямля
Непрытомным спомінам.
І рукамі не ўтрымаць,
Не загушкаць стомаю.
Развучыліся спяваць
Мы з сястрой, бяздомныя.
Рэхам кліча звон, плыве,
Толькі пад нагамі нам
Ні травы, ні астраўкоў,
Ні хусцінкі мамінай.
Дзе надзея, дзе спачын?
Крылы невідушчыя…
Мы куды, зямля ляцім?
Безгалоссе душыць.

kamunikat.org

Пісня

Де з багряних берегів
Дзвін збиває полум’я,
Відштовхнулася земля
Непритомним спомином.
І руками не спіймать,
Не забутись втомою,
Розучилися співать,
Сестро, ми бездомнії.
Дзвін луною зве, пливе,
Тільки під ногами в нас
Не трави єство живе,
А хустинка мамина.
Де надія, де спочин,
Скільки мрій збулося?
Земле, летимо куди?
Душить безголосся.

Переклала ЛюдмилаТаран-Пономаренко

kamunikat.org

Сівы ўспамін

Такой гарачай поўні,
такой сляпучай ночы
Стагоддзямі не ўспомніш,
пакуль у лес не збочыш.
Травою-перамётам,
звярынаю сцяжынай,
То птушкай пералётнай,
то гожаю дзяўчынай
Лячу – не разаб'юся,
ў малітве слупянею,
Я тварам дакрануся
да вечнага камення.
Нас продкі так вучылі:
то бегчы, то ляцець,
Каб не паліць лучыну –
ў грудзях свой светач мець.
Такой вялікай поўні,
такой шалёнай ночы
У цягніку раптоўным,
як на паляне змрочнай,
Не ўбачыш у акенца
карункавай фіранкай.
Мне памяць цісне сэрца:
танклявая паганка
Басонач, толькі ў споднім
да вогнішча выходзіць.

kamunikat.org

Сивий спомин

Таку гарячу повню
в такі сліпучі ночі
Довіку не згадаєш,
докіль у ліс не збочиш.
Травою-переметом,
звіриною стежиною,
То птахом перелітним,
то гожою дівчиною
Лечу – не розіб'юся,
в молитвах сокровінних,
І лик живий й каміння –
всяк горнеться до мене.
Нас предки так навчали:
то бігти, то летіти,
Щоб не палить лучину –
у грудях світ палити.
Таку велику повню
посеред буйства ночі
Я звідала раптово
там, на галяві змрочній.
Не зазирай у вікна –
біліє лиш фіранка.
Так пам'ять серце тисне:
приваблива поганка
Босоніж…серед лісу…
Й вогнем душа тріпоче…

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Свецiцца, свецiцца сiнi мурог,
Падае, падае зорка на стог,
Дымныя, дымныя комiны скрозь,
Дзiўныя, дзiўныя крылы, як лёс.

Белыя, белыя крылы ў руках,
Iх даглядае зняверaны птах.
Крылы i птаха я ў поле нясу,
Каб паглядзелi яны на расу.

Поле далёка, далёка яшчэ,
Слёзы глыбока, глыбока ў рацэ.
Птах мой стамiўся, стамiўся спяваць.
Крылы гараць, i гараць, i гараць…

kamunikat.org

* * *

Світиться, світиться синій моріг,
Падає, падає зірка на стіг,
Димно-задимлені комини скрізь,
Дивна-предивна доля, мов ліс.

Біло-забілені крила в руках,
Наче зневірений, зболений птах.
Крила і птаха я в поле несу,
Щоб подивились вони на росу.

Поле далеко як мрево-мана,
Сльози глибокі, ріки глибина.
Птах мій стомився, стомився співать.
Крила горять, і горять, і горять…

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Зязюля
Зязюлька ляцела, зязюлька кувала,
Каб сонечка ўстала.

Пад адным крылом – ноч,
Пад другім – надвячорак,
А яшчэ – саракоў сорак.
Каб не сорак саракоў,
То жыла б паненкаю,
Не хадзіла б па дварах
З торабай ды кавенькаю.
Так ні жонка, ні ўдава, –
Хто калеку возьме?
Ні страхі, ані вугла,
А з вачэй – ўсё слёзы.

Дзе слёзкі каціліся,
Там дзеткі радзіліся,
Травой спавіліся,
Расою умыліся…

Толькі так зязюлечцы цёмна,
Што ніяк не прыпомніць:
Як малятак назвала,
Дзе сірот пагубляла?

Зязюлька ляцела,
Зязюлька кувала,
Каб сонечка ўстала…

kamunikat.org

Зозуля
Зозулька летіла, зозулька кувала,
Щоб сонечко встало.

Під одним крилом – ніч,
Надвечір'я під іншим
І сорок сороків – як птахи віщі.
Коли б не сорок сороків,
То жила б панінкою,
Не ходила б по дворах
З торбою й ковінькою.
Ні дружина, ні вдова –
Хто візьме каліку?
Ні сім'ї, а ні двора,
І сльози довіку.

Де слізки котилися,
Там дітки вродилися,
Травицею сповилися,
Із криниці напилися…

Зозуленьці світ немилий,
Що з пам'яті розгубила:
Як назвала маляток,
Де їх мама і тато?

Зозулька літала,
Зозулька кувала.
Є сонечко – літа мало…

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

Сем сыноў
У матулі сівой,
Сем асілкаў,
Сем волатаў.
Першы сынок –
Дубок,
Другі – цар вужыны,
Трэці – туман над ярынай.
Чацьвёрты – воўк,
Пяты – крумкач,
(Матуля, не плач),
Шосты – крамень,
Сёмы – агмень.
Сем сыноў
У матулі сівой.
А матуля – крыніца,
Жывая вадзіца.

kamunikat.org

* * *

Синів семеро
У матері-серденька,
Сім гострячків,
Сім силачів.
Перший синок – дубок,
Цар вужиний – другий,
Третій – туман понад лугом,
Сіроманець – четвертий,
П'ятий – чорний ворон, –
Ой, матері горе…
Як вітер – шостий,
Сьомий – вогонь просто.
Синів семірко,
А матері – гірко.
А матуся – криниця,
Живлюща водиця.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Полацку

А ноч плыве пад зорным парасонам
Дрыготкая і крохкая, як шкло.
Мінулае належыла бяссонню,
А будучае – крылы апякло…

Што там яшчэ? –
Далёкая дарога,
Зноў торбу пазычаць у жабрака.
Радкі кладуцца болем і трывогай:
“Сафія спіць.
Спяшаецца рака…”

kamunikat.org

* * *

Полоцьку

А журна ніч спинила білих коней,
Крихка й тремтяча, наче бите скло.
Минуле вже нележало безсонню,
Майбутнє раптом крила обпекло.

Що там іще? –
Незвідана дорога,
Знов торбу позичати в жебрака.
Рядки біжать, складаються в тривогу:
“Софія спить.
Спішить кудись ріка”.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

* * *

Дом мой, кут мой, пачакай, застанься,
Птушкай буду над тваёй страхой…
Ды агонь да вельчыка дабраўся.
Я згубіла крылы і спакой.

Лёс мой, шлях мой, пачакай, змяніся,
Я травой пад брукам прарасту…
Ды крывёю рэкі разліліся,
Камяні размылі і расу.

Час мой, кат мой, пачакай, стаміся,
Зацякаюць рукі і плячо…
Калі на званіцы крыж зламіўся,
Побач доўга плакала дзяўчо.

kamunikat.org

* * *

Дім мій, кут мій, зачекай, зостанься,
Пташкою заб'юсь під темний дах...
Де вогонь у вільху закохався,
Я зронила пера із гнізда.

Доля, шлях мій, почекай, змінися,
Я травою з бруку проросту...
Тільки кров'ю ріки розлилися,
Змили і каміння, і росу.

Час мій, кат мій, почекай, стомися,
Вже рука неміє від плеча.
Коли хрест зламався на дзвіниці,
Поруч довго плакало дівча.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

Прароку

«Чалавек – тупіковае
адгалінаванне эвалюцыі…»
(З газет)

Не пашкадуй,
пайдзі, не азірніся,
Не скамяней пакутлівым слупом,
Бо слёзы, што заўчасна не ліліся,
Не уратуюць веру і… Садом…

Якая вера? Бачыш, бездань ззяе,
І грае, і смяецца, і трымціць,
Там груганне раз'юшаная зграя
Твае сляпыя вочы будзе сніць.

Ужо мяжа збаўлення за спіною,
На плечы важка небыццё лягло,
І на Галгофу шлях вядзе ізгоя,
Там хеўры выць: “Распні, распні яго!”

Хацеў быў лепшым?
Будзеш самым горшым,
Бо чалавецтва ўжо не ўратаваць,
Яму давай відовішча і грошы,
Цябе ж, наіў, так лёгка абылгаць.

Пакінь Садом, пайдзі, не азірніся,
Тваё сумленне – клопатная рэч…
“Перад свіннямі… ды навошта бісер”, –
Хрыстос падумаў, дый падаўся прэч.

kamunikat.org

Пророкові

"Людство – тупікова гілка еволюції..."
(З газет)

Не пошкодуй,
піди й не озирнися,
Не скам'яній в нещирості спокут,
Бо сльози, що завчасно не лилися,
І віру, і Содом вже не спасуть...

Чи віра? Вачиш – там безодня зяє,
І грає, і сміється, і тремтить.
Там слід кривавий і неситість зграї,
Очам сліпим остання світла мить.

За спиною – твоя межа уроча,
На плечі важко небуття лягло,
І на Голгофу шлях крутий, пророче,
Там розпинати – ката ремесло.

Хотів буть кращим?
Будеш ти найгіршим,
Бо людство рятувати – марний труд.
Видовища йому дай, гроші, інше –
Тебе ж охоче брудом обіллють.

Покинь Содом, піди й не озирнися,
Твоє сумління – зайва метушня...
"А перед свинями... намарне бісер", –
Христос подумав – й рушив навмання.

Переклав Микола Костенко

Kantinikat.org

Рагнеда

трыпціх

1

Плач палачаніна па Рагнедзе

Крывічаначка,
ясачка,
птушка,
Жыць далёка ці сілы стае?
Стогадовыя хвоі не глушаць
Развітальныя песні твае.

Як жывецца ў палацы, палоне?
Дождж вяроўкі маркотныя ўе.
Не напіўся з дрыготкіх далоняў,
Не нагладзіўся косы твае.

Адляцела бусліцай у вырай,
Зрабаванай, змарнелай, чужой…
Як цябе мне на волю вырваць?
Скон хіба павянчае крыжом.

2

Развітанне Рагнеды

Я ніколі цябе не пабачу,
Ты апошні шчаслівы мой сон.
Варажу, загаворваю, плачу…
І вянок на вадзе, як праклён.

Вунь і свечачка ўжо пагасла,
І зара плыве па шчацэ…
А у Полацку покуль ясна,
І бацькі жывыя яшчэ.

Там гасцінны наш дом на узвышшы
І любімых братоў галасы…
Вецер зоркамі музыку піша
І ўплятае ў мае валасы…

3

Пусціўся дождж, як на маёй радзіме.
Салёны вецер кветкамі гуляў
І на падлогу мне адну падкінуў,
Пялёсткі-крылы кволай паламаў.

Kamunikat.org

Я заламала рукі разам з кветкай,
І разам з кветкай вецер я малю:
Ты забяры, сцюдзёны, з гэтай клеткі
І пакладзі памерці на зямлю.

Зямля мая, шчарнелая ад болю,
Спустошаная,
ў попеле, крыві,
Зямля мая,
пагавары са мною,
Дачку сваю – пакутніцу, прымі.

kamunikat.org

РОГНЕДА
триптих
1
Плач полочанина по Рогнеді
Кривічаночка,
ясочка,
пташка,
Жити з нелюбом сили чи є?
Твоїм співом, народженим тяжко,
Пуща небо гірке дістає.

Як живеться в палаці, в полоні?
Дощ вірьовки звиває міцні.
Гладять простір далекий долоні,
Бурі моляться коси сумні.

Рідний вирій прийма як буслицю,
Порабовану, вбиту, чужу…
Як же вирвать з неволі зигзицю?
Світ марнотний окреслив межу.

2
Прощання Рогнеди
Я ніколи тебе не побачу,
Сон щасливий – то вже неживе.
Ворожу, замовляю і плачу…
І вінок, як прокляття, спливе.

Он і свічка заплакана гасне,
І зірниця торкнулась щоки…
Там, у Полоцьку, мріялось красно
І в надії молились батьки.

Найгостинніший дім на узвишші
І братів молоді голоси…
Вечір зорями музику пише,
Що вплітається в тугу коси.

3
Пустився дощ, враз спогад – про родину.
Солоний вітер квітку обіймав,
Мені одну до ніг грайливо кинув,
Та пелюстки, мов крила, обламав.

Kamunikat.org

Я заламала руки – де ви, крила?
О вечоре, о вітре серед віт!
Візьміть мене, студені, я безсила.
Я так любила цей холодний світ.

О земле рідна, чорна ти від болю,
Спустошена,
у попелі, в крові,
В останній раз
поговори зі мною…
Прийміть мою спокуту, ще живі!

Переклад Миколи Костенко

kamunikat.org

* * *

Баліць спіна – там будзе месца крылам,
Там будзе месца ветразям спакусы,
Свае нябёсы восенню адкрыла я
І вось цяпер чаўны дабром пакую.

Зязюля кукавала мне даволі,
Зязюля – забабонная старая.
Я ў неба вырываюся паволі,
Я ў неба за сабою не гукаю.

Галёкаць там – не хітрая навука.
Навучаная здрадай і падманамі,
Прашу ў твайго нацягнутага лука я
Не ператворваць птушак на падраненых.

Спіну схаваю, а руку падстаўлю.
Страла, свінец ўжо шкоды не наробяць,
Калецтва рук мне сёння не падстава
Баяцца неба і зямлі не помніць.

Сваё імя чытаю на скрыжалях
І крыжаной вады напіцца мушу.
Мой стрыжань вырываецца стрыжамі
І на зямлі не пакідае крушняў.

Баліць спіна –
Там будзе месца крылам.

* * *

У спині терпко – буде місце крилам,
Там буде місце для вітрів спокуси.
Я небеса ці восени відкрила,
І ось тепер човни добром пакую.

Зозуле, не віщуй мені, доволі,
Не зупиняй пророчими рядками.
Я в небо вириваюся поволі,
Я в небо за собою не гукаю.

Грайливість там – не хитра та наука,
Я навчена на зрадах і обманах,
Прощу тебе – так налаштовуй лука,
Щоб птах не падав жалібним підранком.

Сховаю спину і підставлю руку –
Стріла, свинець вже не наробляять шкоди.
Бо легкість рук – сьогодні запорука,
Що небо рідне і з землею в згоді.

Своє ім'я читаю на скрижалях,
І воду крижану я пити мушу.
Мій стрижень в лет зривається стрижами,
А на землі трима прип'яту душу.

У спині терпко –
Буде місце крилам.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

І ластаўка сляпая прыляціць,
Калі сплыве зара на падваконне,
Парэжа крылы аб лязо прадоння,
Як у вачэй тваіх папросіць піць.

І кінецца да вокнаў, як у рукі,
І паспрабуе зрушыць цішыню.
Той ашалелы звон разбітых гукаў
Пасыплецца крывава на зямлю.

І пацякуць па бездарожжы ночы
Гады мае, павіснуць на плячах,
Як рызманы у жудасним бязвоччы,
Як рэха анямелае ў вяках.

І, можа, ты мяне тады пачуеш,
За плечы возьмеш, схіліш галаву,
Мяне, чужую, да грудзей прытуліш,
Сівую, пакладзеш мяне ў траву.

Kamunikat.org

* * *

І ластівка незряча прилетить,
Коли зоря впаде на підвіконня,
Поріже крила, затамує стогін,
Як у очей твоїх попросить пить.

І кинеться у вікна, наче в руки,
Запрагне з місця зрушить тишину,
Де ошалілий дзвін розбитих звуків
До крові зранить вранішню луну.

І потечуть по бездоріжжю ночі
Роки мої, повиснуть на плечах,
Немов лахміття у пітьмі пророчій.
Її не зрушить ні одна свіча.

То, може, ти мене тоді почуєш,
Баским конем розіб'єш куряву.
Мене, далеку, до грудей притулиш,
Невтішну, покладеш мене в траву.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

* * *

Чорны попел, чорны попел,
Я даўно збіраю кроплі,
Ад дажджу жарыны змоклі,
А крыніцы – без вады.

Чорны верас, чорны верас,
Я даўно шукаю веру,
А брыду у паняверцы
На бацькоўскія клады.

Чорны бусел, чорны бусел,
Я даўно сьпяваць баюся,
Пагубляла словы, мусіць,
Дай мне песню без нуды.

kamunikat.org

* * *

Чорний попіл, попіл чорний,
Я збираю краплі-чари,
Від дощу жарини чахнуть,
А криниці – без води.

Чорний верес, чорний верес,
Я шукаю віру-веди,
Давній скарб шукаю предків –
Я не знаю, йти куди.

Чорний бузьку, чорний бузьку,
Я співати вже боюся,
Слів вогонь шукати мушу –
І в піснях позбав біди.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Я вярталася ў першы свой дзень,
Каб прайсці праз чысцілішча вечнае,
Каб сястрою усім знявечаным…
Я вярталася ў першы свой дзень.

Я вярталася ў родны свой дом.
Сустракалі мяне толькі рэчы,
І люстэрка так недарэчы
Закруціла праменне вузлом.

У куце дагарала свечка,
Некрануты адвар на стале,
І бялюткая, цёплая печка
Пачынала трызну па мне.

Я вярталася полем скалелым,
Галасіла, стагнала, раўла.
Я укленчыла – як умела,
І цяплом дыхнула ралля.

Я вярталася ў маміну веру,
У спрадвечную веру сваю.
Да апошняга ўздыху і нерва
Разбівалася аб зямлю.

kamunikat.org

* * *

Я верталася в перший свій день,
Ідучи повз чистилище вічне,
Прагла бути сестрою калічним…
Я верталася в перший свій день.

Я верталася в рідне тепло –
Зустрічали мене тільки речі,
І люстерко так недоречно
Закрутило проміння вузлом.

Догоряла на покуті свічка,
Золотився відвар на вікні,
І теплом переповнена пічка
Тризну правила вже по мені.

Я верталася полем зомлілим,
Побивалась, стогнала до сліз,
Прикидатися я не уміла, –
І це бачили поле і ліс…

В материнську верталася віру,
У одвічну, дідівську, свою.
І хоч серце, хоч подих мій вирви –
Як земля, на цій вірі стою.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Я патроху вучуся маліцца
І часцей галаву схіляць,
Не шукаю таемнай крыніцы,
Каб агонь у грудзях стрымаць.

Не шукаю адзіную рэчку,
Каб спатоліць смагу сваю.
Я блукаю нябогай адвечнай,
Развітальную песню пяю.

А над прорваю белая птушка
Са зламаным нязграбным крылом
Беспрытульнасць маю загушквае,
Захінае няўдалы мой дом.

Kamunikat.org

* * *

Так потроху й навчуся молиться
І частіше чоло схилять.
Не шукаю зірок у криниці.
То – вогонь, а у мене – земля.

Не шукаю єдиної річки
Вгамувати спрагу свою.
Все блукаю, і це вже звичка,
Та співаю, як воду п'ю.

А над прірвою птаха віща
Із поламаним білим крилом
Безпритульність мою вколише
В дім самотній, що пахне зелом.

Переклав Сергій Осока

Kamunikat.org

Партрэт
Партрэт падобны на мяне…
Усе шляхі матуля бачыць,
Яна спакой не ўскалыхне
І не парушыць вечнасць плачам.

Цераз вякі я бачу сон:
Кладзецца промень светлай смагай.
Я на руках тваіх расой,
Ты на плячах маіх адвагай.

Зноў цераз вечар мост пралёг,
Нібы пярынка, крок за браму…
Бяжыць, не адчувае ног,
Матуля па прадонню рамы.

Kamunikat.org

Портрет

Портрет відтворює мене…
Усі шляхи матуся бачить,
Вона мій спокій не схитне
І в тиші вічній не заплаче.

Через віки я бачу сон:
Кладеться промінь, як засмага.
Це я – роса твоїх безсонь,
Це ти – опліч моїх відвага.

Знов через вечір міст проліг,
Ніби пір'їнка, крок за браму…
Біжить, не відчуває ніг,
Матуся по закрайці рами.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

Ляціць жыццё. Зіма майструе сані.
Апошні ліст прылёг пад абразы.
Я халады сутрэну не радкамі,
А падсвядомым прысмакам гразы.

А клён палаў. Было яму так светла…
Мінуламу малюся наўздагон:
Запомніце мяне вятры і вербы,
Маю празрыстую, як сіні дзень, далонь.

Запомніце шалёнай і шчаслівай,
Дзе па шчацэ не скоціцца сляза.
Я сёння ліўнем, светлавокім ліўнем
Прыйшла, каб восені «даруй мяне» сказаць.

Бо заўтра стану пералётным снегам,
Завею ноччу паркі і сады
І нагбам вып'ю міласціну неба –
Тваё гарачыя няўлоўныя сляды.

kamunikat.org

* * *

Летить життя. Зима майструє сани.
Останній лист приліг під образи.
Я холоди зустріну на світанні
Передчуттям травневої грози.

А клен палав. Було йому так світло…
Минуле рветься піснею з грудей:
Запам'ятай мене, пташиний вітре,
Мою долоню, світлу, наче день.

Запам'ятай шалену і щасливу,
Де по щоці не скотиться сльоза.
Дощем рясним на світлооку ниву
Прийшла я осені "пробач мене" сказать.

Бо завтра стану перелітним снігом,
Вночі завію парки і сади
І вип'ю неба милостиву втіху –
Твої гарячі спалені сліди.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

У далёкім сусвеце
                                    засталіся рукі і вочы.
Мерна вежам старым
                                    адбіваюць стагоддзі званы.
Тут па бруку сам час
                                    белым прывідам крочыць.
Не чакаеш сяброў.
                                    Не шкадуеш уласнай маны.

Kamunikat.org

* * *

У далекому сяйві
зосталися руки і очі.
Темні вежі столітні
зійшлися послухати дзвін.
То по бруку сам час
білим привидом трави толочить.
Друзів пізно чекати.
І пам’яттю пахне полин.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

* * *

I хлінуў дзень забытымі радкамі,
Яго ні супакоіць, ні спыніць.
Бярвяны ліст з пражылкамі-рукамі
Я захіну, ён будзе доўга жыць.

Апошні позірк верасня ўтрапёны,
І доўгая дарога – прыткі птах,
І золата, і неба, і чырвоны
Адбітак золку на старых дубах.

kamunikat.org

* * *

Полився день забутими рядками,
Його ні заспокоїть, ні спинить.
Барвистий лист з прожилками-руками
Я збережу – він буде довго жить.

А потім – зірка вересня в долонях,
Дорога довга і невтомний птах,
І золото, і небо, і червоне
Відлуння грому на старих дубах.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

Яблыня
Бабуля мая – яблыня.
Кожны яблык
з болем і радасцю выношвала,
зялёны
прыціскала да сонца,
спяліла пяшчотай…
А потым
яблыкі зрываліся на зямлю,
каб прарасці новым жыццём.
Бабуля мая – яблыня.

kamunikat.org

Яблуня

Бабуля моя – яблуня.
Кожне яблуко
з болем і радістю виношувала,
зелене
піднімала до сонця,
пестила...
А потім
яблука на землю падали,
проростали новим життям.
Бабуся моя – яблуня.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Вежа

Вежа старая –
Стагоддзяў праклён,
Прывідам-здзекам вачніцы пустыя.
На брукаваным адбітку часоў
Катаржны поступ застыне.

Kamunikat.org

Вежа

Вежа стара –
Як прокляття віків,
Привидом-жахом очниці пустельні.
Час на бруківці відбитками снів
Каторжний поступ простеле.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

Восень

На кульгавым стале
Пакінула восень сваё рыззё.
Павуцінне абляпіла паперы і лісты.
Лета памёрла ў зморшчаных сотах.
Апошняя пчала
Павісла ў пятлі з павуцінавай ніткі.
Восень…

kamunikat.org

Осінь

На кульгавім столі
Осінь забула своє лохміття.
Павутиння папери і листя сухе поснувало.
Літо померло у медом покинутих сотах.
Остання бджола
повисла в петлі з павучачої нитки.
Осінь…

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

Маё змярканне яшчэ далёка,
але чамусці я бачу яго несупынна
ва ўсім навокал:
у ранняй халоднай восені,
птушках, якія паляцелі ў вырай не развітаўшыся,
у састарэлай пажухлай лістоце,
у невясёлых стомленых тварах,
якія праплываюць неяк занадта павольна,
нібы ў сне, побач са мной і вакол мяне…
Я так даўно не бачу шчырых, шчаслівых вачэй.
Яны, быццам халодныя люстэркі,
аддаюць не шкадуючы, мой уласны адбітак.

kamunikat.org

* * *

Моє зав’язання іще далеко,
та чомусь його бачу я все частіше
у всьому навколо:
у ранній холодній осені,
у птахах, що у вирій знялися не налітавшись,
у старому пожовклому листі,
ще – в невеселих, втомлених лицях,
що пропливають занадто повільно,
мовби у сні,
понаді мною і довкола мене.
Я так давно не бачу щирих, щасливих очей.
Вони, мов холодні люстерка,
повертають, бездушні, мій власний відбиток.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Гэтая страла
заляцела ў прыцемкі,
духмяны яблык сусвету
раскалола на дзве паловы:
дзень і ноч.
Здаецца, з гэтага часу
у мяне будзе два жыцці –
белае і чорнае.

Kamunikat.org

* * *
Ця стріла
залетіла в сутінки,
духмяне яблуко світанку
розколола на дві половини:
день і ніч.
Здається, з цієї години
буде у мене два життя –
біле і чорне.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

Заблукала ў лесе надвячоркам,
Ніяк сцяжыну запаветную не знайду.
Але бачу – тры прагаліны
І на кожнай з іх – брама.
За першай жыве змяя,
Ды не хапае ёй мудрасці,
За другой – крумкач,
Ды не хапае яму літасці,
За трэцяй – воўк,
Ды не хапае яму смеласці.
Да якога гаспадара зайсці,
З кім світанку дачакацца?
Стукаю ў першую браму –
Ды змяя джаліць мяне.
Стукаю ў другую –
Ды крумкач гоніць мяне.
Стукаю ў трэцюю –
Ды воўк хаваецца ад мяне.
Блукаю па цёмным лесе,
Шукаю дарогу…

kamunikat.org

* * *

Заблукала в лісі надвечір'ям:
Ніяк не знайду заповітну стежину,
Але бачу – три галявини
І на кожній з них – брама.
За першою живе змія,
Проте не вистачає їй мудрості,
За другою – ворон,
Проте віщих літ мало у нього,
За третьою – вовк,
Проте якби він був сміливіший…
До якої господи заходити,
З ким світанку дочекатися?
Стукаю в першу браму –
Та змія жалить мене.
Стукаю в другу –
Ворон жене мене.
Стукаю в третю –
Вовк ховається від мене.
Блукаю темним лісом,
Шукаю дорогу…

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Тры жанчыны жывуць ува мне.
Чало першай чырванее –
Ёй сорамна за мяне.
Чало другой чарнее –
Ёй балюча за мяне.
Чало трэцяй свеціцца –
Ёй радасна за мяне.

Kamunikat.org

* * *

Три жінки живуть у мені:
Чоло першої червоніє –
Їй соромно за мене.
Чоло другої чорніє –
Їй боляче за мене.
Чоло третьої ясніє –
Вона за мене радіє.

Переклала Людміла Таран-Пономаренко

Kamunikat.org

* * *

Папрасіла ў птушкі вочы –
Стала птушкай.
Папрасіла ў ветра крылы –
Стала ветрам.
Папрасіла пацалунак –
Дзе ж ты, мілы?..

Kamunikat.org

* * *

Попросила в пташки очі –
Стала пташкою.
Крил у вітру попросила –
Стала вітром.
Поцілунок попросила –
Де ж ти, милий?..

Переклала Людміла Таран-Пономаренко

Kamunikat.org

* * *

Ляцела зязюля за сіняе мора,
за высокія горы,
Дзе неба з зямлёй цалуецца
І вецер паўднёвы да хвалі белагрудай
Сватоў сваіх засылае.
Ляцела зязюля без дарогі
Праз імглу і стрэлы вострыя перуновыя.
“Дзе доля твая?” – шапацелі крылы,
“Дзе помста твая?” – мільгацела маланка,
“Дзе смерць твая?” – завываў вецер.
А зязюля ляцела і ляцела,
ляцела і ляцела…
Недзе далёка засталіся гняздоўі родныя,
Бацькі і птушаняты малыя…
“Буду ляцець, пакуль моцы хопіць, –
думала зязюля, –
А калі крылы слабець пачнуць –
назад вярнуся”.
Шмат дзівосаў розных зязюля бачыла:
І як мора гарыць, і як агонь вадой ліецца,
І як зямля агнём палае…
Птушкі прыгажосці казачнай
Да сябе яе ў госці звалі, –
Але нідзе яна не супынілася,
Ні да кога душой не прыкіпела…
Ляцела зязюля за мора,
А чаго шукала – і сама не ведала.

* * *

За синє море летіла зозуля, за гори високі,
Де небо з землею цілується
І вітер південний до хвилі білогрудої
Сватів своїх засилає.
Летіла зозуля, дорогу шукаючи,
Крізь імлу і стріли гострі Перунові.
“Де доля твоя?” – шепотіли крила.
“Де помста твоя?” – миготіла блисківка.
“Де смерть твоя?” – завивав вітер.
А зозуля летіла й летіла,
летіла й летіла…
Десь далеко залишилося гніздо рідне,
Батьки і пташенята дрібні…
“Буду летіти, доки сил вистачить, –
думала зозуля, –
А коли крила слабіти почнуть –
назад повернуся”.
Багато дивини різної зозуля бачила:
І як море горить,
і як вогонь водою ллється,
І як земля у вогні палає…
Птахи пригожості дивної
її до себе у гості звали, –
Та ніде вона не спинилася,
ні до кого не прикипіла душею…
За моря летіла зозуля,
А чого шукала – й сама не відала.

Переклав Микола Костенко

kamtsikat.org

Ліст
Мне верыцца,
Што хутка я атрымаю ліст,
Якога так доўга чакала.
І тады мая парожняя паштовая скрынка
Нарэшце зацяжарыць.
І будзе гэта восенню,
Калі ападзе апошні ліст з дрэва,
А яго падхопіць вецер
І асцярожна пакладзе
На твой пісьмовы стол.
Ён засне разам з табой,
А за ноч пераўтварыцца
У чысты ліст паперы,
Які будзе нагадываць
Пабелены першым снегам
Краявід за акном.
А ты прачнешся раніцай,
Паглядзіш на белы аркуш паперы
І ўспомніш, нарэшце,
Як даўно не пісаў мне.

Kamunikat.org

Лист
Мені віриться,
Що скоро листа отримаю,
Якого так довго чекала.
І тоді моя порожня поштова скринька
Нарешті порадує вісткою.
І буде це восени,
Коли опаде останній листок,
А його підхопить вітер
І покладе обережно
Тобі на письмовий стіл.
Він засне разом із тобою,
А за ніч перетвориться
На чистий лист паперу,
Що так буде нагадувати
Побілений першим снігом
Краєвид за вікном.
А ти рано прокинешся,
Глянеш на білий аркуш паперу
І пригадаєш нарешті,
Як давно не писав мені.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Лета...

Вербалозы, не плачце, я калісці яшчэ вярнуся.
Маім правым крылом будзе бусел.
Маім левым крылом – подых сонца.
Верце. Лета будзе бясконцым.

Kamunikat.org

Літо

Верболози, не плачте, колись я іще повернуся.
Моїм правим крилом буде бусол.
Моїм лівим крилом – соця вежі.
Віpте. Літо буде безмежним.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *
Мы вярталіся дадому,
Дзе стагодзі, нібы дзень,
Дзе зялёны погляд долі
Адбіваецца ў вадзе.

Мы вярталіся да лесу,
Да пагоркаў і травы,
Дзе аддана правяць мессу
Пчолы, шэршні, салаўі.

Я табе чытала кніжку
Без старонак і лістоў,
Плёў павук за ніткай нітку,
Ткаў пасаг гадоў на сто.

Мы вярталіся да раю,
Ты – Адам, а Ева – я.
Бог шчаслівых не карае
Пакуль верыць ім зямля.

Kamunikat.org

* * *

Ми верталися додому,
Де століття – день один.
Там зелений погляд долі
Відбивався у воді.

Ми верталися до лісу,
До пригорбків і гаїв,
Де віддавна правлять месу
Бджоли, шершні, солов'ї.

Я тобі читала книжку
Без сторінок і листків.
Сітку плів павук неспішно,
Посаг ткав, немов казки.

Ми верталися до раю,
Ти – Адам, а Єва – я.
Бог щасливих не карає,
Доки вірить їм земля.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Дом

Дрэвы зверху растуць,
Карані знепрытомнілі вечнасць.
Астудзі цішыню, астудзі.
Грудзі дыхаюць вольна,
Бо неба ў зялёнай квецені.
Нас ніхто не ў праве судзіць.
Дрэвы з неба растуць
І будуюць надзейныя шаты,
Каб ніхто не знайшоў,
Не парушыў сунічны наш дол.
Птушкі сонца нясуць –
Пазалочаны венчык да хаты.
І асвяціць яго
Самы чысты ранішні дошч.

Kamunikat.org

Дім

Дерева згори ростуть,
Коріння знеболило вічність.
Тишу цю заспокой, остуди.
Груди дихають вільно,
Ми з небом зеленим обвінчані.
Що для нас пересуди-суди?
Дерева з неба ростуть,
Нам надійне шатро сплітати,
Щоб ніхто не знайшов,
Не порушив царство суниць.
Птахи сонце несуть –
Позолочений вінчик для хати.
Дощ пророчий освятить
Наші долі і вранішні сни.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

“Хлябы свае пускай па вадзе…”
(З “Новага Запавету”)

Калі зара кранаецца улоння
І шэпча ціха і пяшчотна: “Паляцім…”
Я прачынаюся, я ўся ў яе палоне,
Бо я – трава, мой запавет – расці.

Калі вятрыска мне цалуе вочы
І песціць рукі, плечы, валасы,
Я адраджаюся пасля шалёнай ночы,
Яго любоў – сакрэт маёй красы.

Калі закат агнём крывавіць неба,
Мне ў гэты час нічога не кажы,
Бо я – зямля, і чарназём, і глеба,
Я заўтра – хлеб, а значыць –
будзем жыць.

kamunikat.org

* * *

“Хлеби свої пускай по воді...”
(З “Нового Заповіту”)

Коли зорі пашить ранкове лоно,
Вона шепоче ніжно: “Летимо...”
Я завмираю, вся в її полоні,
Бо я – трава, зелених зір письмо.

Коли вітри мені цілують очі
І пестять руки, а в волоссі дим,
Я повна сили після шалу ночі,
Бо я – люблю, і таїна – у цім.

Коли надвечір закривавить небо,
В цей час нічого не кажи мені,
Бо я – земля, якій приносять треби,
Я завтра – хліб, а значить – будем жить.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Сем крокаў

Жыццё на сямі вятрах
Настоена, быццам песня,
Нібы пуцяводны шлях,
Шалёная смага песціць.

Жыццё – гэта сем дарог
І толькі адна – нябёсы.
Жыццё – гэта сем дароў
І звонкая сіняя восень.

Жыццё – гэта проста быць
І бачыць лясы і пожні.
Сем крокаў – слова «любіць»
І кожны той крок апошні.

kamunikat.org

Сім кроків
Життя на семи вітрах
Настояне, наче пісня,
Мов заповітний шлях,
Веде мене нині й прісно.

Життя – сім важких доріг
І тільки одна – небесна.
Життя – сім Божих дарів
І осені дзвін воскресний.

Життя – просто йти по росі,
І бачити далі ранні.
“Любити” – теж кроків сім.
І кожен той крок – останній.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

Дождж пралiецца – стане светла душам
На чарадзейных сiнiх астравах.
Маё бяссонне свой танок закружыць
На гора мне i на збавенне Вам.

Мая пяшчота зёлкамi шапоча,
У золаце пшанiцы далягляд…
Дарую Вам. Я сёння Ваша прошча.
Я тое, што не вернецца назад.

Kamunikat.org

* * *

Проллється дощ – і душам стане світло
На зоряних весняних островах.
Моє безсоння в музику розлите
Мені на горе, на полегкість Вам.

Моє натхнення травами шепоче,
Пшеничний бог молитву проказав.
Дарую Вам. На провесну, на прощу,
На те, що не повернеться назад.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

Каня
дыптых

1
Каня, дзіўная птушка,
Зноў і зноў вяшчуе каханне:
“Піць, піць, піць...”
Ты не бачыш хіба,
Што рака мая чорная?
Начавала тут поўня нядоўга,
А даўгі раздавала да ранку,
Потым села ў зорны човен
І паплыла куды вочы глядзяць,
Куды сэрца вядзе.
А рака загарэлася,
І згарэла жывая вада.
Дзіўная каня,
Навошта табе гэты боль?

2
Каня, пакінь мяне,
Не праклінай.
Падымуся з калень –
Будзе май.

Каня, калецтва маё –
Не цяжар,
Проста кроў да краёў
Ад крыжа.

Каня, крычы не крычы –
Сон на вадзе...
Боль мой, маўчы,
Май мой ідзе...

kamunikat.org

Каня
диптих
1
Птаха предивна каня
Знов і знов віщує кохання:
“Пить, пить, пить…”
Ти не бачиш, проворна,
Що ріка моя чорна?
Ночувала тут повня недовго,
А борги роздавала до ранку.
Потім сіла у зоряний човен
Й поплилвла, куди очі ведуть.
А ріка запалала,
І згоріла живильна вода.
Дивна каню,
Навіщо тобі оцей біль?

2
Каню, мене покинь,
Не проклинай.
Піднімуся з колін –
Буде розмай.

Моє, каню, каліцтво –
Не тягар.
Просто кров аж по вінця –
Кида в жар.

Каню, кричи не кричи –
Що сон, що вода…
Білю мій, помовчи –
Розмаю хода…

Переклав Микола Костенка

Kamanikat.org

* * *

Мой дзед – каваль.
Ён сёння мне прысніўся,
А я ў яго сядзела на каленях.
І недзе вецер люта ў шыбку біўся,
І недзе горад прарастаў каменны.

А я сядзела ў дзеда на каленях.
Было так лёгка і зусім не страшна.
Утульна печ-ахоўніца бялела
І на стале ляжалі яйкі-крашанкі.

І цікаў на сцяне гадзіннік,
Адлічваў нам стагоддзі і хвіліны…
Мой дзед – каваль. Ён малады і сільны
Вартуе сон дзіцячы светла-сіні.

kamunikat.org

* * *

Мій дід – коваль.
Він знов мені приснився,
А сиділа в нього на колінах.
І вітер лютий в шибку глухо бився,
І місто проростало десь камінне.

А я сиділа в діда на колінах.
Було так легко, страх пропав кудись.
В кутку привітно наша піч біліла,
Й від крашанок весь стіл аж засвітивсь.

І на стіні годинник мирно цокав,
Одлічував століття і хвилини…
Мій дід – коваль. Він, молодий, високий,
Вартує сон дитячий світло-синій

Переклав Микола Костенка

kamunikat.org

* * *

Гарэў касцёл так горача, так ярка,
Яго душу нябёсы берáглі.
Бялела поўня свечкай-недагаркам,
Чарнела сонца скрухаю зямлі.

Гарэў касцёл, а людзі галасілі,
Клялі ў сабе смяротныя грахі.
Шалёны вецер пад крыжом знясіліў
І прытуліўся тварам да страхі.

Гарэў касцёл, а вусны анямелі,
Малюся моўчкі: “Госпадзі, пачуй
Знямоглых нас, мы ацаніць ня ўмелі
Тваю любоў. Даруй жа нас, даруй…

Гарэў касцёл, гарыць ён нават сёння.
Сівеюць скроні і ляціць жыццё…
Не пагарэльцы мы, а навасёлы,
Нам будаваць у сэрцы свой касцёл.

Kamunikat.org

* * *

Горів костьол – немов маяк у вічність,
Гарячу душу зорі берегли.
Біліла повня недогарком свічки,
Чорніло сонце грудкою землі.

Горів вогонь, а люди голосили,
Кляли в собі непрощені гріхи.
Шалений вітер, злоблячись, знесилів,
Рвучи старі солом'яні дахи.

Вогонь горів, вуста закам'яніли.
Молюся мовчки: "Господи, почуй
Безсилих нас. Ціну складать не вміли
Твоїм турботам. Господи, даруй..."

Горів костьол. Вогонь стрибав по гілці.
Сивіють скроні. Роки-буревій...
Ми новосели, а не погорільці,
У серці зводить нам костьол новий.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Зімовае

Суцішся, неба, спачынь,
Чырвонае ты ад болю.
Нялёгка душы лячыць
І перапісываць долі.

І падае з рук пяро
У снег – замяло падлогу.
Зноў ледзяной карой
Пакрыецца сэрца надоўга.

Дарогі мае, як на грэх,
Сышліся наўсцяж бінтамі,
Мой любы, рукі сагрэць
Цяжка на развітанне.

Крывавае неба баліць,
Пульсуе, сцякае свечкай…
Да нашай халоднай зямлі
Дакранаецца вечнасць.

kamunikat.org

Зимове

Небо, спустися, спочинь,
Червоне ти вже від болю.
Гоїти душу не знаєш чим,
Не перепишеш долю.

І падає тінь пера
У сніг – замело підлогу.
Знов льодяна кора
Покриє серце надовго.

Дороги мої, як на гріх,
Зійшлися навхрест бинтами.
Коханий мій, руки зігріть –
Тяжко, де вогник тане.

Кривавиться небо, болить,
Пульсує, стікає свічка…
Як до земної кори,
До серця тулиться вічність.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Жывая вада наталіла мае далоні:
Пі, пяшчотны, ты перайшоў пустэчу.
Цені. Знепрытомнілі дрэвы пад вечар.
Гэта вецер крануўся майго улоння.

Сёння дажджы павяртаюцца ў новае кола,
Ніцыя вербы паверылі, што ацалелі...
Слухай, мой мілы, больш не кажы “ніколі”,
Лепш цалуй мне калені.

Жывая вада асвяціла нам сны і грудзі,
Хмаркі ляцяць, нібы вешчыя белыя птушкі...
Лепшага дня на зямлі ўжо ня будзе.
Ён заблукаў у пушчах.

Kamunikat.org

* * *

Води живильної повні мої долоні:
Пий, страждений, ти перейшов пустелю.
Слухай: тут крона дерев – як стеля,
Теплий вітер торкнувся нечутно лона…

Знов дощі по новому проходять колу,
Никнуть верби – колись і вони шаліли…
Слухай, милий, повік не кажи “ніколи”,
Поцілунками вкрий коліна.

Живильна вода освятила нам сни і груди,
Сунуть хмари за крила пташині дужчі…
Кращого дня на землі вже не буде.
Він заблукав у пущах.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

І зара не зара, і гара не гара,
Калі крэпка рука трымае,
Як на радасць мне лёс дараваў ваяра,
Я на смутак яго прыймаю.

І лясы не лясы, і раса не раса,
Калі блізка вусны і вочы.
Як на шчасце трава, як на шчасце краса,
А я гора сабе прарочу.

Так прыгожа з гары паляцець да зары,
Закахаўся ў яе нават вецер.
Маё сэрца, гары, мой ваяр, гавары,
Пакуль вечар.

Kamunikat.org

* * *

І зоря не зоря, і гора не гора,
Коли руки міцні тримають.
“Твій коханий на радість,” – янгол сказав.
Я ж на смуток його приймаю.

І ліси – не ліси, і роса – не роса,
Коли близько вуста і очі.
Як на щастя – трави шовкова краса,
Чом же горе собі пророчу?

Так приємно з гори полетіти до зір,
Коли крила – закоханий вітер.
Моє серце, гори, любий мій, говори…
Вечір. Літо.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Камяніцай іду, камяніцай,
А пад сэрцам крывавіць пячаць,
Быццам першая ў свеце агніца
Ці апошняя зорка ў вачах.

Пустазелле вакол, пустазелле,
Камяніскі, як вочы сляпых.
Млын стары ўжо не меле зерне,
А з пяском перамешвае жмых.

Мне хусцінку на скроні сівыя
Не накіне зняверяны мніх,
Толькі вецер жалобна завые,
Да плячэй дакранецца маіх.

Толькі рэха званы патрывожыць,
Толькі вечар нацягне струну…
Я шукаю ў краіне астрожнай
Тых, каго берагла і люблю.

Я гукаю ў краіне астрожнай,
Я шукаю ў краіне нямой
Сем братоў маладых і прыгожых
І пярсцёнак вясельны свой.

Камяніцай іду, камяніцай…

kamunikat.org

* * *

Битим шляхом іду, битим шляхом,
А під серцем кривавить печать.
Я позбулась одвічного страху
Від останньої зірки в очах.

Пустозілля довкіл, зрада кревна,
Пустозір'я, як очі сліпих.
Млин старий вже не меле зерня,
А з піском перемішує жмих.

Не накине на мене хустку
Геть зневірений добрий чернець,
Тільки вітер гудітиме в пустку,
Обійнявши за плечі мене.

Тільки дзвони лунають тривожно,
Тільки вітер натягне струну…
Я шукаю в країні острожній
Тих, кому зберігала весну.

Я гукаю в країні острожній,
Я шукаю в німій стороні
Сім братів. Лиш вони допоможуть
Перстень щастя здобути мені.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Па зрэб'і, па голым полі,
Дзе вершнікі зніклі даўно,
Дзе вольнаму – вольная воля,
А волі – бізун ды сядло.
Ішла, прыгіналася долу,
Ішла да цяпла і жытла
Сястра мая меншая, кволая,
Жабрачка, нябога адна.
І нехта лічыў яе восенню
Ці, можа, галінамі дрэў,
А вочы яе – просіні,
А словы – апошні спеў.
Так хутка на плечы кволыя
Спакусай снягі-бадзягі,
А ногі ў нябогі голыя,
А вусны гараць – смага.
Шукала мо лёсу і долі,
Ішла да цяпла і жытла…
Дзе вольнаму – вольная воля,
У полі каліна расла.

kamunikat.org

* * *

Стернями, голим полем,
Де вершники зникли давно,
Де вольному – вольна воля,
А волі – батіг та сідло,
Ішла, пригиналася долу,
Ішла до тепла і житла
Небога, жебрачка квола,
Менша моя сестра.
У ній хтось побачив осень,
Гарячу зливу листків,
А очі у неї – просинь,
Уста – то прощальний спів.
Ляже на плечі кволі
Спокусою сніг-туляга,
А ногі в небоги – голі,
А губи горять – спрага.
Шукала, мо', кращої долі,
Ішла до тепла і житла.
Де вольному – вольна воля,
У полі калина росла.

Переклала Мая Львович

kamunikat.org

А там...

Далей, на поўдзень, ехала,
А там ... гняздо пад стрэхамі.
Ратуй, абарані!

Святло ў акне не гасіцца,
Туманам рэчка засціцца.
Ратуй, абарані!

А колы мне: “Ты – кволая!”
А там – палі ўжо голыя.
Ратуй, абарані!

І птушкі там ... у выраі,
Як я. Шапочуць крыламі
Над цягніком маім.

kamunikat.org

А там…

На південь далі їхала,
А там… гніздо під стріхою.
Рятуй, оборони!

У вікнах вогник мріється,
Туманом нічка вкриється.
Рятуй, оборони!

А колесо: “Та квола ж ти!
Там голо!” – каже колесо.
Рятуй, оборони!

І там… птахи у вирії,
Як я. Шепочуть крилами
Над потягом моїм.

Переклала Мая Львович

kamunikat.org

* * *

Крыніца гаючая,
крыніца пякучая,
надзея мая і роспач,
ратунак і смерць мая,
паднімеш мяне да неба,
каб потым штурхнуць на дол,
шчасця пажадаеш,
каб напрарочыць бяду.
Углядаюся ў вочы твае…

Kamunikat.org

* * *

Моє джерело цілюще,
моє джерело пекуче,
надія моя і розпач,
рятунок і смерть моя,
мене підносиш до неба,
щоб потім штурхнути на діл,
щастя мені зичиш,
щоб наврочити біди.
В очі твої вдивляюся…

Переклала Мая Львович

kamunikat.org

* * *

Купілі на ночку,
Прадалі за ночку
Каханне ў цярновым вяночку.
Паападалі з вяночка кветкі,
На абразок пакладіся.
Не нарадзіліся з цёрну дзеткі, –
Кветачкамі засталіся.

Купілі на ночку,
Прадалі за ночку
Каханне ў цярновым вяночку.

kamunikat.org

* * *

Купили за нічку,
Продали за нічку
Кохання в терновім віночку.
Пообпадали з віночка квіти,
На образи упали.
З терночка не народилися діти,
Квітами залишилися.

Купили на нічку,
Продали за нічку
Кохання в терновім віночку.

Переклала Мая Львович

kamunikat.org

* * *

Хто вучыў мяне раны гаіць
Апошнім уздыхам сонца,
А пасля сустракаць поўню
Не воўчым выццём,
А каралямі промняў на шыі?
Дзе ў кожным – маленькі сусвет
І вялікія, важкія кроплі
Ранішняга дажджу.

kamunikat.org

* * *

Хто навчив мене рани гоїти
Останнім подихом сонця,
А потім стрічати ніч
Не вовчим виттям,
А намистом із променів?
Де у кожнім – маленький всесвіт
І велика, важка краплина
Ранішнього дощу.

Переклала Мая Львович

kamunikat.org

* * *

Да зары мне чакаць,
да зары.
Пamiралі радкі і сябры.
Быў бярозы стрыманы плач,
На вакно прылятаў крумкач
І сядаў, быццам родны, за стол,
І складаў свае крылы на дол,
Закалыхваў мяне да пары…
Да зары мне чакаць, да зары.

Kamunikat.org

* * *
До світанку чекати тепер.
Був рядок і помер.
Був і помер друг.
На вікно прилітав крук,
Мов би рідний, сідав за стіл,
Свої крила складав на діл,
Колихав мене до пори…
До зорі зачекай, до зорі.

Переклала Мая Львович

kamunikat.org

* * *

Прайдзі скрозь мяне навылёт,
Балючы, важкі год,
Як прайшло гэтае неба
ў сумётах наваколля,
Наскрозь,
як галіны дрэў,
Што прыбіліся да старога плоту,
Нібы да бацькоўскага берага,
Наскрозь,
як гэты дождж.
Ды няма яму ні канца ні краю…

Kamunikat.org

* * *

Наскрізь пройди мене,
болючий року,
Як пройшло крізь мене
це небо у кучугурах,
Як пройшло крізь мене
гілля дерев,
Що прибилося до старого тину,
Мов до батьківського берега,
Наскрізь,
як цей дощ.
Та нема йому кінця-краю…

Переклала Мая Львович

Kamunikat.org

* * *

Першы снег, як воўк галодны,
Рана, рана на палі.
Ты самотны, ты бязродны,
Без цябе душа баліць.

Воўк мой – снег, сляпое лісце
Зноў ад холаду дрыжыць.
Так і я сама калісці:
Выжываць – амаль не жыць.

Выжываць – самота ў сэрца,
Выць, калі агорне жах,
А калі ні ўстаць, ні сесьці –
Па чужых блукаць дварах.

А душа душою тужыць,
А душа душой гарыць…
Белы воўк палямі кружыць
І не ўмее гаварыць.

kamunikat.org

* * *

Першій сніг, як вовк голодний,
Рано поле застелив.
Ти безрідний, ти самотній,
По тобі душа болить.

Вовк мій, сніг мій, брат і вбивця,
Знов від холоду тремтить.
Добре вміла я молиться,
Не боялась самоти.

Жити, як палити листя,
Вити, як огорне жах,
А коли ні пить, ні їсти –
Жебрать по чужих дворах.

А душа все палить груди,
Та ніяк не догорить…
Білий вовк полями блудить
І не вміє говорить.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

Сон

“Жизнь: ножи,
на которых пляшет любящая…»
(М.Цветаева)

Рэжа, рэжа сон мой нож.
А сівая ведзьма-ноч
Прыгаворвае, сычыць:
“Калі любіш, то маўчы”.

Гэты нож – толькі ноч.
Гэты нож зваліць з ног.
“Ты, дзяўчынка, маўчы,
Калі сэрца крычыць”.

А на дрэве – гарнастаі.
А на небе зоркі ўсталі…
Дзе ўзяліся нажы,
Ты мне, ночачка, скажы.

Тут нажы і там нажы,
Як жа мне кахаць і жыць?..
Снег па полю тужыць,
Значыць будзе сцюжа.

kamunikat.org

* * *

Ріже, ріже сон мій ніж.
А старезна відьма-ніч
Заворожує, сичить:
“Якщо любиш, то мовчи.”

Гострий ніж – тільки ніч.
Гострий ніж – звалить з ніг.
“Краще, дівко, мовчи,
Коли серце кричить.”

На деревах – горностаї
З неба зірочку дістали.
Де взялися ножі,
Мамо-ніченько, скажи.

Тут ножі і там ножі,
Як любити, розкажи?
Сніг у полі тужить –
Завтра буде стужа.

Переклав Сергій Осока

kamunikat.org

* * *

Мая зямля—гаючы бінт на целе,
І гэты скарб захоўваць, бараніць.
Я сіні лес, жывых крыніц адценне,
Халоднымі начамі буду сніць.

Дзе зліва мне падманы наваражыць,
Дзе груганнё схавае капяжы,
Зямля травой, зямля сцяжынкай кожнай
Мне наканує верыць, марыць, жыць.

kamunikat.org

* * *

Моя земля – на тілі бинт цілющий,
Цей скарб було даровано мені.
Живі криниці, що таяться в пущі,
В холодну ніч приходять уві сні.

Де наворожить злива тьму лукаву,
Де сліз і бурі станеться злиття,
Земля травою і всіма стежками
Укріпить віру – в маренні – в життя.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Гармонія натхнення

Камень, камень рэжа ценем,
Сонца, сонца ясніць крозы,
Грай, гармонія натхнення,
Грай, пакуль жывыя слёзы.

Серафіму – крылы, крылы,
Немаўляці – сонца, сонца.
Грай, гармонія натхнення,
Грай, гармонія, бясконца.

За мяжой, мяжой – калыска,
У калысцы – ясны сокал.
Грай, гармонія натхнення,
І сляпі пустэчы вока.

Вокны, вокны, мушлі, мушлі, –
Не душы мяне, душа,
Я ляцець дадому мушу
На пярынцы ад крыла.

А гармонія натхнення
Творыцца на тым крыле.
Вечар, вечар, сцэны, сцэны,
Белы ветразь на стале.

kamunikat.org

Гармонія натхнення

Камінь, камінь – сонця жменя,
Сонця, сонця й камінь просить.
Грай, гармоніє натхнення,
Грай, допоки чисті сльози.

Шестикрилля – серафиму,
Сонця, сонця – немовляті.
Грай, гармоніє незрима,
Грай на нашім вічнім святі.

За межою – чар-колиска,
У колисці – ясен сокіл.
Грай, тулись до серця близько,
Освяти пустелю ока.

Вікна, вікна, мушлі, мушлі, –
Не души мене зі зла,
Душе, я летіти мушу
На пір'їнці від крила.

А гармонія натхнення
Твориться на тім крилі.
Вечір, вечір… Боже ймення –
Білий вітер на столі.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Спроба малітвы

Божа,
Падсцялі рагожу
Пад хуткія ножкі,
Пад белыя крылы
Той зорцы астрожнай,
Адзінай…
Ды што гэта я, –
Зноў Цябе не пазнала,
Калі ў вочы глядзела
І прасіла так мала…
Толькі ўсё мне замала:
Не спявала – крычала,
Вокнаў не адчыніла,
А ветру панапускала
У белую, чыстую хату
Праклятую здрадлівай мной.
Даруй…

kamunikat.org

Спроба молитви

Боже,
Постели рогожу
Під ноги натерті,
Під крила отерплі
Зорі пильноокій,
Одинокій…
Та що ж оце я, –
Знов тебе не впізнала,
Коли в очі вдивлялась
І просила так мало…
Мені справді замало:
Не співала – кричала,
Вікна не відчиняла,
Тільки вітер впускала
В білу, прибрату хату
Прокляту
Та, мов чекання, стару.
Даруй…

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

Бабуля-зязюля

Светлай памяці бабулі маёй
Матроны Данілаўны прысвячаю…

Бабуля мая адляцела зязюляй…
Марнела, сівела, сохла,
Але Зніч жыў за сэрца вышэй
І за столю-нядолю.
Стогадовая бабця была,
Мела голас, мо ў салаўя.
Жэўрыла свечкай жыццё,
Дні падлогу ўсцілалі асцём…
Сто гадоў – так бязлітасна мала:
Бабуля і ноччу спявала.
Спяшалася паспець па вясне
Прабегчыся па расе,
У хату вецер ўпусціць,
Косы свае расплясці
І таньчыць, пакуль небакраем
Сонца падымецца караваем…
Так мала сто год на жыццё.
Сцішыўся час – і пацёк…
Не канала бабуля – спявала.
У выраі-вечары зязюляю вечнаю
Ляцела, гарэла, кувала.

kamunikat.org

Бабуся-зозуля

Світлій пам'яті бабусі моєї
Мотрони Данилівни присвячується…

Бабуся моя відлетіла зозулею…
Марніла, сивіла, сохла,
Та Жива-богиня поряд жила,
Дарувала долю високу.
На столітній маківці бабця була,
А співала – солов'їну ноту вела.
Та життя ще свічею жевріло,
Остюками підлогу встелено….
Сто років – так безжально мало:
І вночі бабуся співала.
Поспішала, було, по весні
Пробігтися по росі,
Пустить вечір до хати,
Щоб коси свої розчесати,
І танцює, докіль небокраєм
Сонце займеться короваєм…
Що значить сто літ у житті?
Стишився час – і потік…
Не конала бабуся – співала.
У вирії-вечорі зозулею вічною
Летіла, горіла, кувала…

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

Воўк
А гэты дом да дому не падобны,
Ён не да твару сонцу і траве,
Там каламуціць вёсны воўк галодны
І песні свае дзікія пяе.

І гэты воўк не ведае спачыну:
Ён трушчыць дзверы і вяроўкі ўе,
Мае лісты у бездарожжа кіне,
Пасля маўчыць і цешыцца з мяне.

Яго клыкі – гартоўнае жалеза,
І гэты смак я ведаю даўно,
Але ў душу ваўку свайму не лезу
І на вячэру падаю віно.

А мы з ваўком, як ворагі-блізняты,
Раку шкадобы перайсці ўброд.
Такі жаданы і такі праклятаы,
Распятыя мы разам колькі год.

Наш дом даўно да дому не падобны,
Там свечка сумна ў прыцемкі плыве.
Выводзіць воўк матыў такі жалобны:
Па мне галосіць і мяне кляне.

kamunikat.org

Вовк
А житло це на житло вже не схоже,
Давно згубило радощі свої,
Тут вовк страхіття завиванням множить,
Лякає диким співом солов'їв.

Цей вовк давно не відає спочину:
Він трощить двері і вірьовки рве,
Мої листи у небуття закине –
І мучить так моє єство живе.

Його ікло – гарячіше від леза,
Цю дивну мить я звідала давно,
Та все ж у душу вовкові не лізу
І на вечерю подаю вино.

З тим вовком ми як вороги-близнята,
Розлий-ріку я переходжу вбрід.
Такий жаданий, і такий проклятий.
Розіп'яті ми разом кілька літ.

Наш дім давно на житло вже не схожий,
Там свічка сумно у вікні зітхне.
Мій вовк мотив виводить не вороже:
За мною плаче, клянучи мене.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

* * *

Па беламу – трава,
Па чорнаму – няволя,
Галосіць удава
Савою ў чыстым полі.

Па чорнаму – снягі
Пярыну сцеляць душам,
Дзе волаты ляглі,
Там і сірот задушаць.

А пушчы хараство
Спяліць птушыны вырай.
Лятучае яство
Успомніць сны пра крылы.

Успомніць даўніх дзён
Жывую таямніцу:
Хто ў вышыні анёл,
Той на зямлі – крыніца.

А прашчур скажа нам:
“Не будзі яко черві…”
І херувім, як храм,
Асвяціць шлях вячэрні.

kamunikat.org

* * *

По білому – трава,
По чорному – неволя.
Голосить удова
Совою в чистім полі.

По чорному – сніги
Перину стелять душам,
Де велети лягли,
І сиріт там задушать.

А в лісовій красі
Пташа гніздо гойдає.
Душа, що спить в ясі,
Крилаті сни згадає.

Згадає давніх днів
Живую таємницю:
Хто ангел в вишині,
Той на землі – криниця.

А пращур скаже нам:
"Не будьте яко черви…"
І херувим, як храм,
Шляхи осяє темні.

Переклала Наталка Фурса

Kamunikat.org

* * *

Дзе на захад, дзе на захад –
Толькі птушкі, толькі птушкі,
Дзе на волю, дзе на волю –
Вой-Стрыбог,
Я пазнаю па сцяблінкам
Твае нетры, твае пушчы,
Я пазнаю па слязінкам
Усіх нябог.

Kamunikat.org

* * *
Де на захід, де на захід –
Шлях пташиний, шлях пташиний,
Де на волю, де на волю –
Струг-Стрибог,
Я пізнаю по стеблинах
Твої нетрі, твої страхи,
Я пізнаю по сльозинах
Всіх небог.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Пераверцень—трава,
Вярні сэрца.
Вярні сэрца,
Вярні веру.
Вярні веру,
Вярні боль.
Калі прыйдзе ноч,
Я знайду цябе на срэбным узмежку.
Пабачу – і аслепну.
Пачую твой голас – і аглухну.
Памалюся…і знікну.
Назаўсёды застануся
Сярод высокай травы.

Kamunikat.org

* * *

Перевертень-трава,
Віддай серця.
Віддай серця,
Віддай віру.
Віддай віру,
Віддай біль.
Коли прийде ніч,
Я знайду тебе на срібнім моріжку.
Побачу – й осліпну.
Почую голос твій – і оглухну.
Помолюся… і зникну.
Розчинюся назавжди
Поміж високої трави.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

* * *

Спявай, пустэча!
Дзверы ў вечнасць
Адчыніш ты перада мной,
Знямоглай, кволай, недарэчнай,
Але жывой.

Спявай, пустэча!
Мая доля
Калені збіла да крыві.
Цяпер табе дарую волю:
Чаруй, жыві.

Спявай, пустэча!
Люты вецер
Маю пакуту нагбам піў,
Бо на вяртанне я прырэчана
Да родных ніў.

Kamunikat.org

* * *

Співай, пустеле!
Двері в вічність
Відчиниш ти душі моїй,
Ослаблій, кволій, непрактичній,
Але живій.

Співай, пустеле!
Сходить доля
Кривавим маком між трави.
Тепер тобі дарую волю:
Чаруй, живи.

Співай, пустеле!
Вітер спечний
Єство моє, мов воду, пив.
Я на повернення приречена
До рідних нив.

Переклала Наталка Фурса

kamunikat.org

* * *

Наш дом – толькі ветру шум,
Наш дом – папяровая цацка,
Дзьмухну на яго знянацку –
І вось ужо ў небе кружу.

Шукаю свой дом. Туманы
Кранаюцца босых ног,
Начамі траву-быльнёг
Тулю да спакус падманных.

Мне вокны ў лясных краях
Мільгнуць хітравата вокам:
І змоўкне ў вецці сарока,
І знікну, як прывід, я.

kamunikat.org

* * *

Наш дім – лише вітру змах.
Наш дім – паперова цяцька.
На нього дмухну зненацька –
Й кружляю у небесах.

Шукаю свій дім. Тумани
Торкаються босих ніг.
Цілющі трави нічні
Тулю до спокус-обманів.

Віконце в лісних краях
Моргне, мов лукаве око:
І змовкне в гіллі сорока,
І зникну, мов привид, я.

Переклала Наталка Фурса

Kamunikat.org

* * *

Я.Купале

А ў далонях яго – жывая вада,
Напівайцеся, хто яшчэ можа...
А ў сівых гарадах – то нуда, то бяда.
Слепне кожны.

А ў грудзях гарадоў чарадзеі-агні
Душы паляць.
Захіні свайго сына, радзіма, прымі...
Рэжа памяць.

Kamunikat.org

* * *

Я. Купалі

А в долонях його – живая вода,
Пийте, пийте, хто іще може…
А у сивих містах – то печаль, то біда.
Сліпне кожен.

А у грудях тих міст чародії-вогні
Душі палять.
Пригорни свого сина, вітчизно,
бо дні
Ріже пам’ять.

Переклала Наталка Фурса

kamunikat.org

* * *

За воляю сорак год
Мы, бяздомныя, крочылі.
Гінуць сарокі-саракавіны.
Вочы твае, як ночы,
Вусны твае – руіны.

За берагам – не снягі,
Сцягі гарацъ спарахнелыя,
Быў ты мне дарагі
Вострымі стрэламі.

Слаў ты мне гарады
Ды з палянамі яснымі,
Я ж любіла сады
Птушкаю-ястрабам.

Я ж любіла жыццё,
Цішыню бузіновую.
Ты не сукню дарыў – асцё
І віно бізуновае.

kamunikat.org

* * *

За волею сорок літ
Бездомними ми ходили.
Гинуть сороки-сороковини.
Очі твої, як ночі.
Губи твої – руїни.

За берегом – не сніги,
Стяги вогнями зітлілими.
Був ти мені дорогий
Гострими стрілами.

Стелив міста мені ти
З галявами красними.
Я ж любила сади
Птахою-яструбом.

Тишу слухати в бузині…
Тож не сукню любовную –
Волосяницю даруй мені
І криваве вино жертовнеє.

Переклала Наталка Фурса

kamunikat.org

* * *

Крылы – серца майго адценне,
Толькі ў сэрцы – пякучы боль,
Дзе душа – галавешка, а цела –
Можа, дрэва, а, можа, дол.

Маё сэрца ўрастае ў глебу:
Мулка спаць, але мякка ўпасць.
Прылягло на галіны неба,
Як яго з баразны дастаць?

Я гукаю, а гукі, як рукі
Прытуляюцца да грудзей,
Дзе калісці ахвярныя руны
Прарасталі, жывілі людзей.

У краіне, дзе любяць вешаць
Аняменне – практычнасці знак…
Неба – птушкам, мне – галавешка,
Дужа зручна ганяць сабак.

Kamunikat.org

* * *

Крилам в серці моєму тісно,
Все заповнив щемливий біль,
Де душа – головешка, а тіло –
Може, дерево, може, діл.

Серце в скибу вростає темну:
М'яко падати, мулько спать.
Гілочки тисне долу небо –
Як його з борозни дістать?

Я гукаю, а гуки, як руки,
Притуляються до грудей,
Де у древності жертовні руни
Проростали, живили людей,

Там повішених – як сережок,
Хто практичні – німують усі.
Небо – птахам, мені – головешку,
Щоб могла проганяти псів.

Переклала Наталка Фурса

kamunikat.org

* * *

Адным няўлоўным сном-крылом
Спатоліць ноч тваё маўчанне,
І перапоўніць сумны дом
Шалёны вецер на світанні.

Сплывуць да рэчкі груганы
Вачэй-сірот, агней няўтольных.
Не будзе праўды і маны
На дне маёй сляпой далоні.

Прачнецца воўк сівой тугі,
Мой кроўны брат зямны і жорсткі,
Ён разрывае ланцугі,
Як спарахнелыя вяроўкі.

Той воўк не ведае жалю
І воля, як закон адзіны,
Яго паставіць на зямлю,
На ўсе сумненні, люті, кпіны.

Ён разарве маркот асцё,
І грэх, і жах, і памяць болю,
Калі нясцерпнае жыццё
За шыю сцісне маю долю.

Я палячу ў знаёмы лес,
Сустрэну сонца зорнай песняй…
Душа падымецца з калень,
І засмяецца, і ўваскрэсне.

Kamunikat.org

* * *

Єдиним зламом – сном-крилом
Втамує ніч твоє мовчання,
Та розгойда сумне житло
Шалений вітер на світанні.

По річці круки попливуть
Очей-сиріт, вогнів неситих.
Не буде істин і облуд
На дні доріг і рук розкритих.

Проснеться вовк – сніги, сніги.
Мій кревний брат, земний і лютий.
Він розриває ланцюги,
Немов легкі, зітлілі пута.

Той вовк не відає про жаль,
І воля, як закон єдиний,
В земну його покличе даль –
На згубу, сумніви і кпини.

Він розірве ярмо сует,
І гріх, і жах, і присуд долі,
Коли важке життя моє
За шию стисне вільну волю.

Я в лісі ранньої зорі
Зустріну співом лик чудесний,
Й душа моя на повен зріст
Зведеться радо і воскресне.

Переклала Наталка Фурса

Kamunikat.org

Сон

І адчынюцца вароты,
І прапусцяць хеўру соў.
На галіны дрэў самотных
Сядзе сыч – крылаты сон.

І прыйдзе ваяр няўмольны
З дзідай вострай у руцэ,
Ён адчайны, ён бяздомны
Плыў стагоддзі па рацэ.

І павіснуць лахманамі
Рэшткі здрады і маны.
І вада пайдзе кругамі,
Дзе жылі калісці мы.

Kamunikat.org

Сон
І розчиняться ворота,
І пропустять зграю сов.
На гілки дерев самотніх
Сяде сич – крилатий сон.

Прийде воїн невмолимий,
Гострий спис в його руці,
Він, бездомний і сміливий,
Плив століття по ріці.

І повиснуть лахманами
Рештки зрад, оман, подій.
Де любов була між нами –
Тільки кола на воді.

Переклала Катерина Туз

Kamunikat.org

* * *

Калі не стане ні трывог, ні жалю,
Згарбеюць плечы, вырасце кара,
Я прычашчуся ростанню вакзальнай
З рашучасцю сівога ваяра.

Калі не будзе вечара і ночы
Знякроўленым, зняверaным радкам –
Па берагу нябёсаў буду крочыць
І ластаўку сваю нясці ў руках.

Я рукі-крылы гаварыць прымушу
І вырушу ў сусвет, нібы ў агонь.
Дзе птушкі-сёстры і лясныя душы,
Дзе паранунак і прытулак мой.

kamunikat.org

* * *

Коли жалю й тривог уже не стане,
Згорбіють плечі, виросте кора,
Я причащусь вокзальним розставанням
З хороброю рішучістю: пора...

Коли не буде вечора і ночі
Знекровленим, зневіреним рядкам,
Небесним краєм серце йти захоче
І ластівку свою нести в руках.

Я руки-крила говорити змушу,
Ступлю в світанок, ніби у вогонь,
Де птахи-сестри і соснові душі,
Де край рятунку й прихистку мого.

Переклала Катерина Туз

kamunikat.org

* * *

Не паспяваю жыць
не для сябе, для іншых,
І дарагіх людзей
губляю па чарзе.
Гарадць мае лясы –
душу ўкрывае іней.
Гарыць мая зямля –
скляпенне сноў-надзей.

Не паспяваю жыць
за хлебам, не за срэбрам
І некалі сустрэць
сваіх сівых сяброў.
Ляціць, ляціць жыццё
да брамы ў лютым небе.
І не хапае сіл,
і не хапае слоў…

* * *

Я не встигаю жить –
o, не собі, для інших.
І дорогих людей
втрачаю у біді.
Горять мої ліси –
вкривае душу іній.
Горить моя земля –
склепіння снів-надій.

Я не встигаю жить –
за хлібом, не за сріблом,
І н***і***коли зустріть
своїх сяйних сябрів.
Летить, летить життя
до брами в Отче світло.
Не вистачає сил,
не вистачає слів…

Переклала Наталка Фурса

Kamunikat.org

Парасткі
трыпціх

1

Камень гэты – пачатак травы,
Гартаваны кавалак карэння.
Веру я: ён жывы, агнявы,
Адзічэлы продак насення.

Камень гэты – пачатак дажджу,
Анямелы ад буры і ветру,
Бачыць ён развітання мяжу
І світанак прарошчвае ў вечар.

Гэта ён вучыць нас сталець.
Нават здрада яго не зламіла.
Ён ляжыць на роднай зямлі,
Значыць памятае пра крылы.

2

Ячменнае зерне – жыццё
Гарчыць, і гарыць, і смяецца...
Ў руцэ безпрытуллем – асцё,
І птушкаю ў небе – сэрца.

Сяўба прарасце ў абмалот,
Імчацца, сівеюць стагоддзі...
За вокнамі – новы год,
І новае зерне ўсходзіць.

А сэрцу час – трын-трава, –
Зару сустрэчамі мерыць.
І вучыць мяне трываць,
Кахаць, і марыць, і верыць.

3

Трава прарастае ў дажджы.
Сіротства маё ўтравела.
Дарога бяжыць, бяжыць,
Сівеюць косы, сівеюць...

Ад веку да веку – дажджы,
Астрогі, званіцы, пагосты...
Мне трэба за ўсіх дажыць,
Адмерыць золкія вёрсты.

kamunikat.org

Дарога бяжыць, бяжыць…
Трава прарастае ў сэрца:
“Хто ты на зямлі скажы,
А потым – не страшна ўмерці”.

kamunikat.org

Паростки
триптих

1
Камінь – це прапочаток трави,
Загартований згусток коріння.
Вірю я: він вогнений, живий
Дикий предок тугого насіння.

Камінь – це прапочаток дощу,
Занімілий у бурях предтеча,
Бачить він розставання межу
І пророщує ранок у вечір.

Лише він загартує й навчить.
Навіть зрадою множити силу.
Він на рідній землі, та щомить
Пам’ятає про небо і крила.

2
Життя – то ячмінне зерно,
Гірчить, і горить, і сміється…
В руці залишає воно
Устюк, а у небі – серце.

Сівба проросте в обмолот,
Століття відійдуть сиві…
У літо нових турбот
Зведуться нові посіви.

А серцю час – трин-трава,
Він стрічами ранок міря,
Терпіти мене навчав,
Кохати, мріяти, вірить.

3
Трава проростає в дощі.
Сирітство в траву врослося.
Дорога крізь нетрі душі
Тече – і сивіють коси…

Вода з віку в вік біжить:
В’язниці, дзвіниці, погости…
За всіх мені треба дожить,

Одміряти версти босі.

Дорога біжить, біжить…
Трава проростає в серце:
“Хто ти на землі, скажи,
А потім – не страшно і вмерти”.

Переклала Наталка Фурса

Kamunikat.org

З паэмы “Рагнеда”

1

А душа душою тужыць,
А душа душой баліць…
Я пляту з хмарынак кужаль,
Ён не ўмее гаварыць.

Па сцяжыначцы сірочай
Пабягу ў гушчар лясны,
Стану я сястрою воўчай
На імгненне, да вясны.

Стану я сястрою ночы,
Нашча сэрца – далягляд.
Вып’ю келіх – буду танчыць,
Пацячэ жыццё назад.

Я дзяўчынкай так любіла
На Дзвіну глядзець з гары.
Недзе спіць мой Полацк мілы,
А душа зарой гарыць…

Паляцела б я галубкай
Ці бусліцай маладой.
Там мой бацька топіць грубку,
І жыве каханы мой.

На хвілінку, на імгненне
Палячу на край зямлі.
Там гаворыць і каменне,
У мядах цвітуць палі.

Хто маю душу палечыць?
Вунь крумкач на хвоі спіць,
Пад крылом ракою вечнасць,
Я не ў змозе пераплыць.

Апаліла даль світанкам,
Тоне, тоне птушка-ночка…
А за ёю я падранкам,
А за мною сон сірочы.

Kamunikat.org

З поеми “Рогнеда”

1

А душа душею тужить,
А душа в душі болить…
Я плету з хмаринок кужіль,
Він не вміє говорить.

По стежині-перестою
Побіжу в гущавину,
Стану вовчою сестрою,
Помсту виношу страшну.

Стану я сестрою ночі,
Обрій зблисне, мов сльоза.
Вип’ю келих снів пророчих –
Потече життя назад.

Я дівчатком так любила
Розглядать Двіну з гори.
Там замріявсь Полоцьк милий,
В душу здалеку зорить…

Полетіла б як голубка
Чи лелека молодий.
Там мій батько топить грубку,
І живе коханий мій.

Хоч на мить одну осінню
Полечу, о синь-земля!
Там говорить і каміння,
У медах цвітуть поля.

Хто ще душу полікує?
Жду я ворона й сову,
Вічність – з ними, тільки чую –
Не дійду й не доплиunion…

Обпалила даль світанком,
Тоне, тоне пташка-ніч…
А за нею я підранком,
А за мною – сон сторіч.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

2

Дзе гарэла папараць-кветка
Да зары,
Мне крумкач прынёс вестку.
– Гавары!

Гавары, пакуль вецер
Яшчэ родны, як брат,
Гавары, пакуль кветкі
Яшчэ сіла сабраць.

Пачакай, мая згуба,
Дыхай вольна душа.
Хто душу не галубіў,
Не напіўся з каўша.

Бачыш, кропля за кропляй
Пот каціўся, і кроў
Запякалася. Кросны
Ткалі зоркі без сноў.

І схіляліся песні
Да гаючай травы,
Там за права ўваскрэснуць
Йшлі ўміраць ваяры.

Мне каралі на шыі,
Як вяроўкі былі.
Я кашулю пашыла
Да зямлі, да зямлі…

А крумкач безпрытульны
(У зрэнках тухне зара):
– Хутка будзеш матуляй, –
Выгукнуў, як мара.

Подых свечачкі-поўні,
Спомін траў і мядоў
Сэрца сына напоўніць.
Ён вярнецца дамоў…

Тут крумкач схамянуўся,
Да камення прынік:

– Ноч-матуля мінула.
– Гавары, гавары…

Kamunikat.org

2

Де горіла папороть-квітка
До зорі,
Приніс ворон утішну звістку.
– Говори!

Говори, доки вітер
Мені рідний, як брат,
Говори, доки квіти
Маю сили зібрать.

Почекай, моя згубо,
Душе, дихай вільніш!
Душу хто не голубив,
Той не випив свій ківш.

Глянь, заплакані сосни…
Як кора, я горю.
Переболені кросни
Тчуть безсонно зорю.

Непоборена пісне,
В диких травах гірких
Йшли за право воскреснуть
Невмирущі полки.

Ось на шиї коралі,
Як солодка петля.
Як же тяжко карає
Ця земля, ця земля…

Чорний ворон на хаті
(Погляд – вічна жура):
– Скоро будеш ти матір, –
Набрида, як мара.

Подих свічечки-повні,
Спогад трав і медів,
Серце сина – як спомин,
Він повернеться в дім…

Ворон наче прокинувсь,
Зірко глянув згори:

Karpatnikat.org

– Ранок, мати-княгине.
– Говори, говори…

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

3

Уладзімір

А зараз ты – княгіня.
Спужалася чаго? –
Што Полацк твой загінуў
Ад погляда майго?

Што аўдавелі жонкі,
Што палеглі сыны?
Ты кажаш, што я жорсткі
І спапяліў дамы.

Сватоў я слаў па чэсці,
Табе свой біў паклон.
Я шанаваў бы цесця,
Як трэба, за сталом

Па келіху б мы ўзнялі
За вольны наш саюз,
Калі б ты не пракляла
Усю маю сям'ю.

Калі б ты не назвала
Рабычычам мяне,
Зязюля б не кувала
Сярод сівых камней.

І вёскі не гарэлі б,
Не распіналі б дзеў,
І рэкі не крывелі б…
Я на цябе глядзеў!

Сама цяпер рабыня,
Рагнеда-Гарыслава.
Калі зара астыне –
Ты будзеш гора славіць.

Kamunikat.org

3

Володимир

А зараз ти – княгиня.
Злякалася чого?
Що Полоцьк твій загинув
Від погляду мого?

Що повдовіли жони,
Що полягли сини,
Що я, скипівши жовчу,
Страшний, як вир війни?

Сватів я слав по честі,
Тобі свій бив поклін.
Я шанував би тестя,
На пир прибув би він.

Ми піднімали б чари
За вільний наш союз…
А ти… прокляття слала
На всю свою сім'ю.

А ти…мене назвала
Рабичичем тоді.
Зозуля закувала
Тривожно: буть біді!

І села не горіли б,
Не розпинали б дів…
А в ріках … мертво тіло…
А в мене… в серці гнів!

Тепер рабою стала,
Рогнеда-Горислава.
Про те, як горювала,
Співай!.. Ти маєш право.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

4

Як дзіўна, сэрца, і як страшна:
Мой валадар адзіны – кат.
Ён люты, гожы і адважны
І мне яго чакаць, чакаць…

Вяшчунка-доля так няўтольна,
Напіўшыся маёй крыві,
Яна сказала непрытомнай:
“Кахай, Рагнеда, і жыві”.

Мой князь, мой кат,
мой вораг любы,
Цябе Стрыбог на муку мне
Паслаў,
на невараць, на згубу,
На скон сярод нямых камней.

Гарэць, гарэць ў агні пякельным,
І ненавідзець, і кахаць…
Ды не ў палатах княжых – келлі
Цябе чакаць і праклінаць.

Kamunikat.org

4

Як дивно, серце, і як страшно:
Володар мій єдиний – кат.
Він лютий, гожий і відважний,
Мені ж – зотліти від чекань…

Віщунка-доля так невтоленна,
П’ючи мою щоденно кров,
Вона сказала в ніч шалену:
“Кохай, Рогнедо, знов і знов”.

Мій князю, кате,
враже любий,
Тебе послав мені Стрибог
На муку,
на пекельну згубу,
На скін, де зла тугий клубок.

Горіть мені в огні ненатлім,
Крізь ненависть тебе кохать.
У келії, а не в палаці
Тебе чекати й проклинать.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

5

Пераверцень-трава, вярні сэрца.
Шэры дзень і шэрая ноч…
Некаханай лягчэй памерці
У бязмежжы гадоў і прошч.

Некаханай лягчэй да сонца,
Чым да сэрца каменнага зваць.
Дзе гняздзіцца тваё бяссонне,
Вораг мой, перасмешнік, таць?..

kamunikat.org

5

О чар-зілля, як серце терпне…
Гасне день, не тихішає дощ…
Некоханій легше померти
У безмежжі років і прощ.

Некоханій простіше сонце
Окликати, ніж серце те…
Де гніздиться твоє безсоння,
Зловороже моїх пустель?

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org

6

Дождж пралiецца –
стане светла душам.
На могiлках падымецца трава.
I будзе вецер
песнi мацi слухаць,
А бацькава сiвая галава
Вярбiнаю нахiлiцца да долу,
Да долу, да крынiцы,
да раллi...
Ваша дачка ўжо хутка будзе дома,
Яе краса,
нiбы быльнёг,
згарыць.
I будзе вечнасць
спапяляць iмгненнi,
А воля захлынацца у крывi...
Рагнеда крыж сумлення будзе несцi
Далёка ад радзiмае зямлi.
“Дачушка, кветачка, –
Рагнедзе снiцца мацi, –
Як дакранешся сонечнай мяжы,
Пабачыш дзень,
i будуць дзверы насцеж,
Душу сваю,
як неруш,
зберажы”.

kamunikat.org

6

Дощі проллються –
стане світло душам.
На могилках підніметься трава.
І вітер пісню
на вустах просушить,
А мого батька сива голова,
Верба немов, нахилиться додолу,
До долу, до криниці,
доріллі…
Ваша дочка вже хутко буде вдома,
Красі її
лишилось
догоріть.
І буде вічність спопелять імення,
А воля захлинатися в крові…
Нести Рогнеді криж свого сумління
За межі, де батьки були живі.
“О, доню, квітко, –
сон Рогнеді сниться, –
Коли покличе сонце до межі,
Настане день –
ти будеш вільна птиця.
А зараз…
чисту душу
збережи”.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

7

Мой сынок, паглядзі на мяне,
Ты хіба не пазнаў матулю?
Я канаю сярод камней
Сівой ластаўкай беспрытульнай.

Толькі вочы яшчэ гараць.
У іх – помста і памяць волі.
Маё сэрца даўно – кара,
Не скаруся ні кату, ні долі.

Княжа мой, пакладзі ў труну
Васілёчкі з палёў радзімых,
І свяшчэнную даўніну,
І гаротны погляд Радзімы.

Абдымі мяне, неба, мацней.
Дзе кайданы хароняць песні,
Прыгайце, людзі, мяне,
Калі я аднойчы ўваскрэсну.

kamunikat.org

7

Синку мій, подивись на мене,
Ти хіба не впізнав матусю?
Я конаю серед каміння,
Наче ластівка безпритульна.

Тільки очі гарячі ще,
У них – помста і пам’ять волі.
Моє серце – це сум і щем,
Не корюся ні кату, ні долі.

Княже мій, поклади в труну
Василечки – послання щире,
Найсвященнішу давнину,
Погляд милої Батьківщини.

Небо, міцно мене обніми.
Про кайдани співати годі,
Буде світло в кінці пітьми –
Я воскресну в моїм народі.

Переклав Микола Костенко

Kamunikat.org

8

У доме маім два акна,
Два розных жыцці-дарогі:
У першым – прывід вайны,
Ў другім – прыгажосць ад Бога.

Змяшаліся попел і кроў,
А хочацца жыць і маліцца.
Даўно чалавека баіцца
Світанак – прыстанак буслоў.

У першым акне – зіма,
Закідвае смецце парогі,
І кат – чалавек дарагі,
І шыбеніцы, і астрогі…

Будуюць цэрквы ў другім,
Дзіцяці смяецца чыста…
Вы вокны мае – берагі,
Я рэчкай плыву агністай.

Kamunikat.org

8

В домі моїм два вікна,
Два різних життя, дві дороги:
В першім – привид війни,
В другому – благості Бога.

Змішалися попіл і кров,
А хочеться жити й молитись.
В людському світанку змаліти
Лелека боїться знов.

У першім вікні – зима,
Заносить снігами пороги,
І кат – сіроманець дороги,
Й остроги – там берег дріма…

Та зводять церкви в другім,
Дитина сміється чисто…
У вікнах моїх – береги,
Я руслом пливу вогнистим.

Переклав Микола Костенко

kamunikat.org